СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня.
Мінск — 8.27, 15.53, 7.26;
Віцебск — 8.25, 15.36, 7.11;
Магілёў—8.16, 15.43, 7.27;
Гомель—8.06, 15.48, 7.42;
Гродна — 8.41, 16.10, 7.29;
Брэст — 8.33, 16.19, 7.46.
МЕСЯЦ:
Апошняя квадра 28 снежня.
ІМЯНІНЫ:
Фірса, Калініка, Філімона, Апалонія, Яна, Максіма.

ЗВЯЗДА

Газета выдаецца са жніўня 1917 года

27 снежня 1991 г. ПЯТНІЦА
№ 247 (21775)
Цана 20 кап.

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ АД 18 ДА 18 СУТАК

МІНСК

«ЦІ ХОПІЦЬ ГЭТЫХ ЯКАСЦЕЙ ІНШЫМ?»

Гісторыя СССР дапісана канчаткова. Прэзідэнт СССР М. С. Гарбачоў у адстаўцы. Гэтага моманту чакалі даўно: хто з радасцю і задавальненнем, хто — з трывогай і смуткам. Па-рознаму можна ставіцца да гэтага чалавека: хваліць, ганьбіць, але абыякава — нельга.

Гісторыі яшчэ належыць даць ацэнку яго дзейнасці, што сёння думае народ — можна пачуць у любой чарзе. Але давайце не будзем спрашчаць. Мы задалі адно пытанне: «Што вы думаеце аб дзейнасці М. Гарбачова?» людзям на вуліцах Мінска:

П. ШЭСЦЕЛЬ, настаўнік з Навагрудскага раёна:

— Ведаеце, можа я скажу і крыху эмацыянальна, але ў мяне такое пачуццё, што мы нешта страцілі, асірацелі нават, калі хочаце. Ці хопіць у іншых палітыкаў такой вытрымкі, дыпламатычнасці, інтэлігентнасці?.. Крытыкаваць за чыёйсьці спінай было лёгка, цяпер жа ўвесь цяжар праблем давядзецца ўзваліць на ўласныя плечы.

М. НЕСЦЕРАЎ, інжынер:

— Яшчэ ў 1984 годзе я паверыў у яго, і з таго часу думка мая не мянялася. Вось хіба што Вільнюс у студзені гэтага года, калі пралілася кроў, але хто там разбярэцца, як было на самай справе? Цяпер жа атрымалася, што ён нікому не патрэбны, апынуўся за бортам, нават адправіць у адстаўку не змаглі па-чалавечы, падзякаваць хоць, ці што...

Н. БЕЛАХВОСТАВА, кіяскёр:

— А краіну хто разваліў? Чыя віна, што льецца кроў у Тбілісі, Карабаху... Сёння ўсе кажуць аб яго заслугах, а як назваць гэта? Хоць у нашай краіне заўсёды так было: вінаватага знайсці лягчэй. Я не ведаю, асабіста нічога супраць яго не маю...

Фёдар КАЛПАТАЎ, пенсіянер:

— Мне за яго дзесьці нават крыўдна. Гэта вельмі разумны і добры чалавек. Прынамсі, пры ім весела было жыць, што ні дзень — абавязкова нейкія новаўтварэнні. А калі сур'ёзна, я глыбока паважаю гэтага чалавека. Сам я прадукт, так сказаць, сістэмы, і вельмі добра ведаю, што значыць пайсці супраць яе. А што добра было ў час застою — дык гэта хлусня. У матэрыяльным плане, у прынцыпе, лепш. Але гэта, прабачце, адчуванні свінні: у карыта налілі —вось і добра. Па двары вольна пабегаць можна толькі перад смерцю. Не хачу я ўсіх са свіннямі параўноўваць. Але ўсё ж Гарбачоў на многае вочы раскрыў. І нават мне, камуністу з 1939 года.

Любоў ТКАЧУК, повар:

— Нічога асаблівага ў гэтым я не бачу. Усё, што можна было, ён разваліў, а цяпер можна і на пенсію? Прабачце, тое ж самае і з Ельцыным будзе. Ды і ў рэспубліцы ўсе гэтыя суверэнітэты да дабра не давядуць.

ЗАЯВА ГАРБАЧОВА МАГЛА Б БЫЦЬ БОЛЬШ АПТЫМІСТЫЧНАЙ

МАСКВА, 26. (Кар. ТАСС Андрэй Паларыя). Як лагічны вынік таго, што адбылося ў былым Саюзе, ацаніў адстаўку Прэзідэнта СССР Міхаіла Гарбачова ў тэлефоннай размове з карэспандэнтам ТАСС Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч. Адзначаючы адстаўку Міхаіла Гарбачова як станоўчы факт, кіраўнік беларускай дзяржавы разам з тым сказаў, што «палітычная заява Прэзідэнта СССР магла б быць больш аптымістычнай, ужо вельмі ў ёй многа змрочнага».

ЧАТЫРЫ ПІШАМ, ТРЫ ЗАПАМІНАЕМ

Як ідзе прызнанне Рэспублікі Беларусь краінамі свету!

Як праінфармавалі ў Міністэрстве замежных спраў, афіцыйна, учора аб прызнанні Беларусі ваявілі ЗША. Беларусь прызналі Польшча, Швецыя, Балгарыя.

З неафіцыйных крыніц стала вядома, што ў бліжэйшы час аб гэтым паведамяць таксама Нарвегія, Румынія і Чэха-Славакія.

АДПАЧЫВАЕМ 2 СТУДЗЕНЯ

У мэтах стварэння спрыяльных умоў для адпачынку працоўных і рацыянальнага выкарыстання рабочага часу Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь пастанавіў:

Перанесці дні адпачынку з суботы 28 снежня 1991 г. на чацвер 2 студзеня 1992 г., з суботы 4 студзеня 1992 г. на панядзелак 6 студзеня 1992 г.

ПЫТАННЯЎ З ХАРЧАВАННЕМ НЕ БУДЗЕ

КАРЭЛІЦКІ РАЁН. Невядома, што чакае навучэнцаў школ пасля лібералізацыі цэн. Як яны будуць харчавацца ў час вучобы? Школьнікам жа, якія жывуць на тэрыторыі калгаса «Ленінскі шлях», пашанцавала. Вучні пачатковых класаў будуць харчавацца тут на працягу ўсяго навучальнага года бясплатна, а для старшакласнікаў адна ўмова — адпрацаваць у калгасе летам пэўны тэрмін.

РАДЫЕНУКЛІДНЫ ЗАЯЦ

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ. З надыходам Новага года назіраецца значнае ажыўленне сярод паляўнічых. Са стрэльбамі ў руках мераюць яны доўгія кіламетры па лясах, палях, лугах. Вельмі ж ужо хочацца ў зіхаценні навагодніх ёлак пачаставацца свежай дзічынай.

Аднак удача на паляўнічых сцежках — з'ява рэдкая. Бо дзікіх жывёл у апошні час з-за «хіміі», забруджання навакольнага асяроддзя радыенуклідамі, меліярацыйных работ, браканьерства і г. д. стала куды менш, чым раней. Калі ж і пашанцуе на зайца, дзіка ці лася, то з трафеямі трэба спяшацца ў санэпідэмстанцыю — праверыць мяса на ўтрыманне радыенуклідаў.

Вынікі часцей за ўсё несуцяшальныя — ужо выяўлена нямала выпадкаў, калі прыносілі на аналіз дзічыну з такіх адносна «чыстых» раёнаў, як Гомельскі, Жыткавіцкі, Петрыкаўскі, Калінкавіцкі і Мазырскі, а яна аказалася забруджанай радыяцыяй. Работнікі СЭС раяць паляўнічым на зыходзе года Авечкі частаваць сваіх гасцей хатняй баранінай, якая добра пойдзе пад чарку. Толькі дзе ўзяць тое і другое?

ВА ЎРАДЗЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

СПАДЧЫНА ВАЕННЫХ — «СПАДЧЫННАСЦЬ ЧАРНОБЫЛЯ»

Як вядома, Міністэрства абароны СССР перадало нашай рэспубліцы ў бясплатнае карыстанне будынкі і збудаванні, пабудаваныя за кошт сродкаў савецкага боку ў ваенных гарадках Рэспублікі Польшча і Венгерскай Рэспублікі.

Распараджэннем урада Беларусі два ваенныя гарадкі перададзены фонду развіцця і дзейнасці Міжнароднага аздараўленча-рэабілітацыйнага цэнтра для дзяцей Беларусі «Спадчыннасць Чарнобыля». Усе будынкі і збудаванні ваенных гарадкоў [illegible] ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

А. ЗАЙКОЎСКІ.

Міхаіл ДЗЯМЧУК:

«ПЛАСТЫ НОВЫХ РЭАЛІЙ ВЫМУШАЮЦЬ ДА РЭФАРМАЦЫІ ЎСЁЙ САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ»

Усім відавочна: сёння нельга больш утрымаць сацыяльную сферу ў тым стане, да якога мы прывыклі, хоць і ўзроўнем яе [illegible] не задавальняў грамадства. Зараз жа з'явіліся дзве новыя магутныя рэальнасці, якія карэнным чынам павінны змяніць традыцыйныя падыходы да фарміравання і выкладання сацыяльна-культурных праграм. Гэта — рынак і рашучасць народа ў стварэнні новай дзяржаўнасці, сапраўды незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Як паўплываюць яны на складаны сацыяльны комплекс, што чакае нас заўтра? Аб гэтым гутарка спецыяльных карэспандэнтаў «Звязды» з намеснікам Старшыні Савета Міністраў М. ДЗЕМЧУКОМ.

— Міхаіл Іванавіч, каб пазбегнуць у разважаннях нейкіх абстрактных дэфініцый, асцярожнай агульнасці, давайце выразна акрэслім новыя вуглавыя моманты тэмы...

— Напачатку пытанне: а што значыць рынак у сацыяльнай сферы? Гэта — рынак ідэй, рынак спецыялістаў, рынак увогуле культурных каштоўнасцей. **Задача [illegible] заключаецца ў тым, каб надаць усяму інтэлектуальнаму патэнцыялу рэспублікі максімальна таварны выгляд** — ён павінен быць канкурэнтаздольным і мець попыт не толькі ў сістэме Садружнасці Незалежных Дзяржаў, але і — галоўным чынам, — за мяжой. Таму неабходна тэрмінова прымаць адпаведныя, прадыктаваныя жыццём законы, уздымаць на сучасную вышыню ліцэнзійна-патэнтную службу і да т. п. Інакш мы будзем мець не сапраўды інтэлектуальны рынак, а нейкую занядбаную крамку...

Што датычыць сацыяльных праграм, то ў рыначных умовах яны павінны быць не пасіўным, а самым моцным стымулам пераходу да цывілізаванага жыцця. Інакш кажучы, іх звышзадача — вымушаць людзей на максімальнае выкарыстанне ўласнага творчага багажу, штурхаць да найбольш поўнай рэалізацыі творчых здольнасцей чалавека, асабліва таленавітага.

І яшчэ: неабходна цвёрда ўсвядоміць — **настаў час, калі не абысціся без лінейнай узаемасувязі навуковага патэнцыялу і эканамічнага комплексу рэспублікі.**

— Прабачце, аднак тут паўстае надзённае пытанне: куды павінна інтэгравацца эканоміка Беларусі — у сусветную, еўрапейскую, азіяцкую плынь? Адказ стане вызначальным і для напрамку развіцця той жа навукі, сістэмы падрыхтоўкі кадраў і г. д. Возьмем за арыенцір Захад — тут адзін варыянт абмену спецыялістамі, навукова-тэхнічнымі ідэямі, навінкамі; азірнёмся на Усход — спатрэбіцца зусім іншы расклад...

— Хоць гэтыя разважанні могуць каму-нікаму падацца вельмі ўжо глабальнымі, аднак менавіта такая вось тэорыя і дыктуе непасрэднай надзённай практыцы зусім канкрэтную мову дзеянняў. Зараз рэспубліка на раздарожжы. Так, ёсць даўнія і ў нечым трывалыя, адладжаныя ўзаемасувязі з былым савецкім Усходам. Аднак эканоміка такога, напрыклад, традыцыйнага і буйнога партнёра, як Расія, мае шмат відавочных мінусаў. Заходняя Еўропа выгадна адрозніваецца ўсім бачнай адладжанасцю сваёй прамысловасці, непараўнальна высокім тэхналагічным узроўнем. **І паколькі мы знаходзімся ў самым цэнтры кантынента, то варта аддаць перавагу не інерцыйнай учарашняй лучнасці з Расіяй, Украінай, іншымі рэспублікамі, а другому — менавіта заходняму шляху інтэграцыі** — ён хутчэй прывядзе да рэанімацыі хворай беларускай эканомікі, забяспечыць прарыў у сусветную супольнасць, да больш цывілізаванага жыцця.

— А якой тады бачыцца ўсходняя палітыка?

— Безумоўна, нельга скідваць з вагаў рэсурсную падпітку Расіі, Украіны, Казахстана, нельга нішчыць тыя каналы, што забяспечваюць жыццядзейнасць нашага перапрацоўчага прамысловага комплексу. Рэальнасць дыктуе спалучэнне абодвух варыянтаў, аднак яна ж, паўтару, адначасова ставіць пытанне і аб паступовым адыходзе ад традыцыйнай аднабаковасці ў пошуку эканамічных партнёраў. Пры гэтым я не бачу ніякіх супярэчнасцей паміж толькі што сказаным і нядаўнімі вядомымі дамоўленасцямі па лініі Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Бо ўсім было б выгадна, калі б адна з краін СНД была нейкім акном, брамай у Заходнюю Еўропу: відавочна, што калі нейкая замежная фірма адкрывае ў Мінску сваё прадстаўніцтва, то яна зусім лёгка атрымае выхад і на іншыя рэспублікі.

Падсумоўваючы сказанае, хачу зазначыць: нейкія фрагменты эканамічнай інтэграцыі будуць і з Амерыкай, і з Паўднёва-Усходняй Азіяй, іншымі рэгіёнамі, але галоўны напрамак — заходнееўрапейскі. Тут зыходны прынцып пры фармулёўцы ўсёй стратэгічнай задачы. Не маючы дакладнай генеральнай канцэпцыі, мы проста не разбярэмся ў сотнях прапаноў аб супрацоўніцтве з нашай рэспублікай, не вылучым найбольш важкія, грунтоўныя. **Выйсце ў адным: няўхільна прытрымлівацца палітыкі дакладна вызначаных дзяржаўных прыярытэтаў, сапраўды дзеяздольнай дзяржаўнай канцэпцыі.**

Будзем, аднак, рэалістамі: нам не ажыццявіць намечанага, не «зазямліць» тэарэтычныя выкладкі без замацавання мінімуму жыццёвага ўзроўню, без фіксаванага дзяржавай узроўню сацыяльнай абароны асобы. Толькі пры гэтай умове грамадства здолее рушыць наперад, падтрымаць пакет перспектыўных урадавых прапаноў.

— У чым вы бачыце стратэгічны рэзерв, які забяспечыць прарыў на рубяжы новага, цывілізаванага жыцця?

— У навуцы, адукацыі, культуры. Гэта аснова. І гэта аксіёма. Менавіта зараз, калі крызіс паглыбляецца, азначаная сфера не проста патрабуе да сябе павышанай увагі — мы абавязаны аднесці яе да разраду самых жорстка вызначаных і кантралюемых дзяржаўных прыярытэтаў. У іншым выпадку пераходны перыяд, у які рэспубліка толькі-толькі ўступіла, расцягнецца не на 10—20 гадоў, а ўвогуле на паўстагоддзе, калі не назаўсёды. **Перспектыва застацца адвечнай перыферыяй Расійскай імперыі для Беларусі, на жаль, не знікла.** Свой лёс нам вызначаць самім жа.

— Што ў такім разе становіцца найбольш актуальным у навуковай гаспадарцы?

— Асноўнае тут зараз — каваць уласны інтэлектуальны патэнцыял. Дзеля гэтага мы павінны прафінансаваць тыя школы і структуры фундаментальных даследаванняў, якія маюць прарыў у сусветную навуку, набылі высокі рэйцінг на міжнароднай арэне. Пры ўяўнай прастаце пастаноўкі пытання тым не менш з'яўляецца неабходнасць сапраўды карэнных рэфармацый у нашай фундаментальнай навуцы.

Аднак трэба глядзець на становішча спраў цвяроза: **сёння бюджэтным фінансаваннем можна сілкаваць не ўвесь яе абстрактны комплекс, а менавіта найбольш важныя і перспектыўныя праграмы, раздзелы.** Паўтаруся яшчэ раз: мы вымушаны праводзіць палітыку жорсткіх прыярытэтаў. Інакш — распыленне сіл і сродкаў, а ў выніку — «нулявы» варыянт.

Што датычыць навукоўцаў-«прыкладнікоў», то ім неабходна яшчэ і яшчэ раз максімальна шчыльна ўвязаць свае асноўныя пошукі з запатрабаваннямі вытворчасці. Сёння існуюць дзесяткі два рэспубліканскіх навукова-тэхнічных праграм, якія толькі крыху арыентуюцца на канкрэтную эканоміку, але ж «крыху» ў цяперашніх умовах — нішто. Таму **ёсць неабходнасць няўмольнай прынцыповай рэвізіі раней складзеных планаў.** Тым больш, што часцей за ўсё яны злучаны паміж сабой чыста механічна.

Гэта адзін бок справы. Па-другое, на чале кожнай зноўку абгрунтаванай праграмы павінен стаць мясцовы — падкрэсліваю — мясцовы, наш, беларускі галаўны інстытут. Патрабаванне новае і даволі складанае, бо раней так званыя «галаўнікі» канцэнтраваліся ў асноўным у Цэнтры. Вядома, новыя лідэры абавязаны дасканала валодаць тэматыкай даследаванняў, мець высокую ступень даверу ў ніжніх навуковых звёнах, каб на практыцы ажыццявіць увесь намечаны цыкл мерапрыемстваў, не спыніцца недзе на паўдарозе.

— Міхаіл Іванавіч, а якая роля адводзіцца таму інтэлектуальнаму патэнцыялу, што належаў раней да структур былога Цэнтра, асабліва да «абаронкі»?

— Тут сапраўды досыць сталых, здольных, шукаючых лабараторый, груп, калектываў. Але жыццё актуалізавала, завастрыла пытанне: як жа развіваць далей абаронную тэматыку, калі рэспубліка аб'явіла сябе бяз'ядзернай, нейтральнай дзяржавай? Праблема фармулюецца ў класічным філасофскім запытанні: быць увогуле такім даследаванням ці не?

Адказ наступны. Многія спецыялісты ваенна-прамысловага комплексу дзякуючы сваёй адмысловай кваліфікацыі могуць з вялікім запасам задаволіць патрэбы эканомікі звычайнай, цывільнай. Вось яны і павінны падключыцца зараз на конкурснай аснове да распрацоўкі вышэйназваных рэспубліканскіх праграм. Сяму-таму з Акадэміі навук, ВНУ давядзецца, мабыць, уступіць гэтым «навічкам» — **ад здаровай канкурэнцыі ў навуцы нікуды не дзецца.** Ну, а тыя «абаронцыкі», чые веды, здольнасці, інтарэсы зарыентаваны выключна на спецыфічныя інтарэсы арміі, таксама могуць асабліва не хвалявацца: такія лабараторыі, калектывы па-свойму унікальныя, іх абавязкова знойдуць установы, навуковыя цэнтры Расіі і Украіны, якія працягваюць пошук у адпаведных напрамках. Больш таго: ёсць у беларускіх «абаронцыкаў» і такія тэмы, якія можна і трэба развіваць у інтарэсах вялікай навукі супольна з заходнімі калегамі.

— Карэкціроўка навуковых накірункаў патрабуе і адпаведных змен у прынцыпах іх фінансавання?

—Раней падтрымліваліся або ўвогуле калектывы, або пэўныя тэмы даследаванняў — аснова неэфектыўная, неабавязковая. Не дзіўна, што пры гэтым раскладзе канкрэтны практычны выхад хваляваў вучоных пастолькі, паколькі. Аднак настаў час, калі мы мусім **перайсці на прынцыпова новы для нас, але даўно апрабіраваны ў развітых краінах шлях крэдытавання навукі.** Калектыў, які адчувае сваю моц, можа браць пад свае пошукі крэдыты са спецыяльна створаных банкаўскіх фондаў. Праз пэўны час іх трэба пагашаць, таму, беручы грошы, навукоўцы ўжо задумваюцца, пралічваюць варыянты: брацца за гэту вось тэму альбо аддаць перавагу другой ідэі; для яе рэалізацыі неабходна запрасіць таго вунь «штатнага» доктара навук, альбо гэтага вось галавастага кандыдата?.. Такім чынам мы зноў сутыкаемся з **неабходнасцю карэнных рэформаў у арганізацыі навукі.**

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ЗАГАДКА ГАРБАЧОВА

Вось і закончыўся рэальны палітычны шлях яшчэ аднаго «выдатнага і буйнага дзеяча нашай эпохі» — як прывыклі мы ахрышчваць кіраўнікоў такога рангу. І калі адных ягоных папярэднікаў —Леніна, Сталіна, Брэжнева, Андропава, Чарненку — праводзілі з арэны прама на сваіх плячах іх паслядоўнікі, а аднаму — Хрушчову — сціпла нагадаўшы пра няздольнасць кіраваць, дык Гарбачову нібыта далі магчымасць зрабіць выбар самастойна... Але ж ці так гэта на самай справе?

Уласна кажучы, да ягонай адстаўкі з паста прэзідэнта краіна і ўвесь свет былі падрыхтаваны. Падрыхтаваны самім развіццём падзей — імклівым, у вялікай ступені — заканамерным, праўда, іншы раз — неадназначным.

Ужо сёння Міхаіла Гарбачова многія называюць вялікім рэфарматарам. Што ж, ён ім быў. Быламу Саюзу ССР Міхаіл Сяргеевіч хацеў дабра, і ўжо толькі па-гэтаму першаму і апошняму Прэзідэнту СССР месца ў гісторыі гарантавана.

А яшчэ яго называюць вялікім палітыкам для... Захаду. Парадокс? Недаразуменне? Думаю, ні тое, ні другое. Гарбачоў і сапраўды быў выдатным партнёрам для заходніх палітычных дзеячаў. Вялікім жа палітыкам для Усходу, для сваёй роднай Айчыны ён, на вялікі жаль, не стаў, і такім наканавана быць іншаму. Каму? З адказам пачакаем...

На фінішы ягонай прэзідэнцкай кар'еры з ім абышліся, на першы погляд, непрыгожа. Спачатку кіраўнікі трох славянскіх суверэнных дзяржаў на сустрэчы ў Мінску, а потым — і лідэры адзінаццаці былых саюзных рэспублік у Алма-Аце праігнаравалі Гарбачова пры ўтварэнні новай Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Яго гэта крыўдзіла, нервавала. Міхаіл Сяргеевіч выступаў з заявамі, інтэрв'ю, пасланнямі, аднак у глыбіні душы разумеў: ягоная ўлада заканчваецца. Гэтак паступілі з ім, мне здаецца, невыпадкова. Барыс Ельцын, Ле[illegible] «нябачання»: незадоўга да сустрэч у сталіцах Беларусі і Казахстана . прэзідэнт краіны адкрыта прадэманстраваў няўвагу і непавагу як да думак лідэраў трох рэспублік, так і да падзей у іх, і асабліва — на Украіне. **Не разумеў Міхаіл Сяргеевіч галоўнага — на вуліцы іншы час.**

Пачаўшы перамены крыху больш шасці гадоў назад, названыя літаральна адразу ж перабудовай, Гарбачоў з цягам часу... спалохаўся іх сам. [illegible] рацца з непрыступнай крэпасці ў аб'ект «даўгабуда», а калі называць рэчы сваімі словамі — то і ў прывід.

Больш, чым уласны народ, у пераменах як у свеце ў цэлым, так і ў краіне, яго падтрымлівала заходняя гарбаманія. Захапіўшыся ёй, Гарбачоў, на маю думку, больш пачаў думаць аб сваім рэнаме на Захадзе, чым... аб нас з вамі. Не навучыў яго і жнівень 1991-га... Застой гарбачоўскіх рэформ, асабістага мыслення прэзідэнта пачаў раздражняць не толькі людзей, а найперш — кіраўнікоў новых незалежных дзяржаў былой савецкай імпе[illegible] Пратрымаўся, каб сам ход развіцця падзей пераканаў прэзідэнта ў адсутнасці ў яго рэальнай улады, у неабходнасці падаваць у адстаўку.

Як лідэр краіны Міхаіл Сяргеевіч вычарпаў сябе ў жніўні, у выніку спробы дзяржаўнага перавароту. Кінуўшы ў турму ў маскоўскай «Матроскай цішыні» сваіх былых бліжэйшых сяброў і паплечнікаў, прэзідэнт, думаецца мне, многіх прымусіў задумацца: дык вось хто ваша акружэнне, Міхаіл Сяргеевіч! **Цэнтрызм** Гарбачова пачаў рассейвацца як ранішні туман. А з ім — знікаць і давер да прэзідэнта, вера ў ягоныя магчымасці вывесці краіну з тупіка.

Сёння ад многіх можна пачуць меркаванне, што толькі пасля жнівеньскіх падзей Гарбачоў пачаў станавіцца сапраўдным палітыкам. Дзіўна, ці не праўда: а хто ж тады кіраваў намі шэсць з лішкам гадоў? Шэсць такіх горкіх, супярэчлівых, неардынарных гадоў! Няўжо і на гэты раз спявалі кіраўніку дзяржавы фальшывыя, падробленыя дыфірамбы? А як расцэньваць тады Нобелеўскую прэмію?

Пытанні, пытанні, пытанні... Іх сёння лягчэй ставіць, чым шукаць адказы.

Трыумф Гарбачова — у заканчэнні «халоднай вайны», адкрыцці перад намі агульначалавечых каштоўнасцей. Ён даў свабоду слову, дэмакратыі, правам чалавека. Ён разбудзіў сілу народную, але, на жаль, далей павесці яе не змог...

Трагедыя Гарбачова— у ягонай нерашучасці, нежаданні пайсці на канчатковы разрыў з мінулым, з тым асяроддзем, якое выхавала і вывела яго на [illegible] мар два... І як вынік: стаў Міхаіл Сяргеевіч заложнікам, нават — ахвярай былой партыйнай бюракратыі.

З імем Гарбачова звязана цэлая эпоха. Ён прыйшоў да прэзідэнцкай улады праз камсамол і партыю, якую, як вядома, потым і ліквідаваў. Ён доўга і настойліва трымаўся за 6-ы артыкул у Канстытуцыі, але ўсё ж прызнаў шматпартыйнасць... Ён, як ужо адзначалася вышэй, даў свабоду слову, і разам з гэтым — затыкаў рот Андрэю Сахараву... Урэшце, ён так і не зразумеў усе тайны і складанасці нацыянальнага пытання ў цэлым, асаблівасці яго у нашай краіне — у прыватнасці... Будучы бліскучым юрыстам, Гарбачоў не змог спасцігнуць і сакрэтаў эканомікі, а ягоныя шараханні ад адной групы эканамістаў-рэфарматараў да другой толькі нашкодзілі краіне...

На жаль, у перспектыву — недалёкую і аддаленую — Міхаіл Гарбачоў не зазіраў. Ён не адчуваў ход развіцця гісторыі хоць бы на крок наперад. А палітыку такога ўзроўню гэта недаравальна.

А канчаткова яго пагубіў... Цэнтр. Без яго, без цэнтральных структур, аснову якіх складалі саслужыўцы Гарбачова па былой КПСС, ён сябе не ўяўляў. За старыя структуры, нават стаўшы прэзідэнтам краіны, ён трымаўся вельмі і вельмі моцна.

Мяне асабіста ў перыяд улады Міхаіла Сяргеевіча больш за ўсё парадаваў вось які факт. У гэты час за ягонай спінай, скажу больш — пры ягоным разуменні — вырасла плеяда новых кіраўнікоў, вартых і часу, і нашай шматпакутнай Айчыны. Не буду пачы[illegible]

І наш Станіслаў Шушкевіч за апошнія месяцы набраў столькі балаў, колькі, несумненна, не меў у палітычнай уладзе на ранейшай усесаюзнай арэне ніводзін прадстаўнік Беларусі.

...З рашэннямі, прынятымі кіраўнікамі новых незалежных дзяржаў у Мінску і Алма-Аце, Міхаіл Гарбачоў не пагадзіўся. Гэтым і толькі гэтым растлумачыў ён сваю адстаўку. Аднак ёсць і іншыя прычыны адстаўкі. Знік Саюз ССР, адпала і неабходнасць прэзідэнцкай пасады. У новым жа кангламераце суверэнных рэспублік месца Гарбачову пакуль што не знаходзіцца. Але, паабяцаў ён, «я буду рабіць усё, што ў маіх магчымасцях, каб пагадненні, якія там падпісаны, прывялі да рэальнай згоды ў грамадстве, аблегчылі выйсце з крызісу і працэс рэформ...»

Яго многія будуць шкадаваць, выказваць яму спачуванні. Хоць, уласна кажучы, нічога асаблівага не здарылася. Ну, не атрымалася ў Гарбачова перабудова, ну, вычарпаў ён сябе як лідэр... На Захадзе, у развітых краінах гэта — натуральны працэс. Шкада, вядома ж, аднаго: што зноў пацярпеў наш народ, зноў не ўдаліся на ім эксперыменты, рэформы, іншыя выпрабаванні. Дай Бог, каб было гэта ў апошні раз!

А сам Міхаіл Сяргеевіч, як кажуць, не прападзе. Чатыры тысячы рублёў пенсія, 20 чалавек аховы, некалькі аўтамашын і дач (акрамя, вядома ж, у Фаросе) — такі адпачынак чакае далёка не кожнага. Ды і адпачываць Гарбачоў яшчэ не збіраецца. Ходзяць пагалоскі аб стварэнні ў недалёкім будучым міжнароднай няўрадавай арганізацыі — [illegible] Маргарэт Тэтчэр, Ро Ду.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

Анатоль МЯСНІКОЎ.

ЧАС ПАДПІСАННЯ У ДРУК: ПА ГРАФІКУ 21.05, НУМАР ПАДПІСАНЫ У 21.05.

КАНЦЭПЦЫЯ

РЭФОРМЫ АПЛАТЫ ПРАЦЫ Ў НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Асноўная мэта рэформы аплаты працы заключаецца ў стварэнні матывацыі і стымулаў да працы, павышэнні яе якасці і прадукцыйнасці. Гэта прадугледжвае адмену ўсякіх абмежаванняў у росце індывідуальнай заработнай платы і прадастаўленне прадпрыемствам і арганізацыям розных форм уласнасці максімальнай самастойнасці ў вырашэнні пытанняў аплаты працы.

Дзяржава рэгламентуе толькі мінімальныя памеры аплаты працы работнікаў розных прафесійна-кваліфікацыйных груп. Выкарыстоўваючы іх у якасці арыенціра, прадпрыемствы самастойна праз калектыўныя дагаворы і тарыфныя пагадненні вызначаюць формы, сістэмы і памеры аплаты працы.

Асноўныя напрамкі рэформы аплаты працы

МІНІМАЛЬНАЯ ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА

Рэалізацыя ўзнаўленчай функцыі заработнай платы мяркуе вызначэнне памеру мінімальнай заработнай платы зыходзячы з мінімальнага спажывецкага бюджэту, што вылічваецца на аснове набору мінімальна неабходных жыццёвых сродкаў, якія складаюць так званую «спажывецкую карзінку».

Мінімальная заработная плата з'яўляецца заканадаўча замацаванай дзяржаўнай гарантыяй і асновай сістэмы аплаты працы. У адрозненне ад мінімальнага спажывецкага бюджэту мінімальная заработная плата падлягае абавязковай выплаце пры захаванні ўстаноўленых заканадаўствам працягласці рабочага часу і выкананні работнікам працоўных абавязкаў. Канкрэтную велічыню мінімальнай заработнай платы прапануецца вызначаць з улікам мінімальнага спажывецкага бюджэту аднаго работніка, які выконвае самую простую работу ў нармальных умовах.

Аўтары канцэпцыі лічаць, што ўключэнне сямейнай нагрузкі ў мінімальную заработную плату [illegible] памеру заработнай платы трэба таксама [illegible] за кошт іншых крыніц.

У дзеючай структуры даходаў насельніцтва (за выключэннем грамадскіх фондаў спажывання) доля заработнай платы складае прыкладна 90 працэнтаў, а астатняя частка прыпадае на асабістую падсобную гаспадарку, даходы па пазыках і ўкладах і інш. Гэтую долю і трэба выкарыстаць пры вызначэнні мінімальнай заработнай платы з памеру мінімальнага спажывецкага бюджэту.

ПЕРАБУДОВА ТАРЫФНАЙ СІСТЭМЫ

Узнаўленне рабочай сілы ва ўмовах разнастайных форм гаспадарання, фарміравання рынку працы з'яўляецца магчымым на аснове [illegible] тарыфнай сістэмы, якая складаецца з тарыфнай стаўкі першага разраду Адзінай тарыфнай сеткі і Адзінага кваліфікацыйнага даведніка. Пры гэтым устаноўленая тарыфная стаўка першага разраду [illegible] асновай для далейшай дыферэнцыяцыі аплаты працы па прафесійна-кваліфікацыйных групах.

Няздольнасць прадпрыемстваў забяспечыць мінімальныя памеры аплаты працы з'яўляецца адной з прычын, па якой яны могуць быць аб'яўлены ў заканадаўчым парадку банкрутамі [illegible] ў першачарговым парадку [illegible].

Рэспубліканская адзіная тарыфная сетка будуецца ў выглядзе шкалы тарыфікацыі і аплаты працы работнікаў усіх галін народнай гаспадаркі [illegible].

У катэгорыі служачых вытворчых і невытворчых галін выдзелены наступныя групы, падзеленыя па прынцыпу міжгаліновага аднолькавага функцый: тэхнічныя выканаўцы, занятыя падрыхтоўкай і афармленнем дакументацыі, улікам і кантролем; спецыялісты вытворчых і невытворчых галін народнай гаспадаркі; кіраўнікі падраздзяленняў і адміністрацыйна-гаспадарчага абслугоўвання, кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў і іх структурных падраздзяленняў. У праекце АТС прадугледжваецца 28 разрадаў тарыфікацыі (група аплаты). У сетцы прынята 11-працэнтнае нарастанне тарыфных ставак ад разраду да разраду ў рабочых і 10,3-працэнтнае нарастанне — у служачых.

Устаноўленыя на аснове АТС мінімальныя тарыфныя стаўкі, якія маюць характар сацыяльных гарантый, на прадпрыемствах і ў арганізацыях могуць [illegible] на аснове ўстанаўлення больш высокай тарыфнай стаўкі першага разраду і захавання прадугледжаных тарыфных міжразрадных каэфіцыентаў. Адносная міжразрадная розніца (у працэнтах) можа павялічвацца (але не змяншацца). Іншымі словамі, шляхам устанаўлення канкрэтным работнікам больш высокіх ставак у параўнанні з прадугледжанымі ў АТС мінімальнымі.

Адзначым, што ў адпаведнасці з Законам «Аб прадпрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» прадпрыемствы могуць устанаўліваць розныя дапаплаты і надбаўкі [illegible] характару, колькасці, якасці і выніку працы, якія [illegible].

Рэформа аплаты працы прадугледжвае ўдасканаленне сістэм выплат за работу ў неспрыяльных умовах, у вячэрні і начны час, а таксама дыферэнцыяцыю [illegible] у залежнасці [illegible].

На думку аўтараў канцэпцыі, [illegible] устанаўлівацца ў (фіксаванай) суме [illegible] ў аднолькавых [illegible] уздзеяння [illegible] на [illegible] кваліфікацыі [illegible] павінна залежаць ад выніку работы [illegible].

[illegible] працуе ў раёнах [illegible] прадугледжваецца [illegible] абласной (фіксаванай) суме, [illegible] залежнасці [illegible] калектыўнага [illegible] пунктаў.

Рэформа аплаты працы, дынамічнасць тарыфнай сістэмы [illegible] ролю [illegible]: зняць [illegible] рэгулятара [illegible] тым, каб [illegible] асновай [illegible] расстаноўкі [illegible] месцах і [illegible] намаганняў работнікаў.

[illegible] існуючага [illegible] зарплаты [illegible] шляхам [illegible] ставак і [illegible] можа пе[illegible] працы і за[illegible] аплаты: за норму — тарыф.

Рэформа аплаты працы прадугледжвае змяненне форм і сістэм заработнай платы. Становіцца непрымальным традыцыйнае дзяленне форм аплаты на здзельную і пачасовую, іх процістаўленне адна адной. Здзельная форма ўключае ў сябе элементы пачасовай і наадварот (напрыклад, размеркаванне калектыўнага здзельнага заработку паміж членамі калектыву прапарцыянальна адпрацаванаму часу; аплата працы пачасовага рабочага на аснове нарміраванага задання, элементы здзельшчыны ў аплаце працы служачых). Да таго ж заработная плата асобнага работніка можа не складвацца з асобных традыцыйных элементаў, а выступаць у выглядзе долі калектыўнага заработку.

Ва ўмовах рынкавай эканомікі ўзнаўленчая функцыя заработнай платы патрабуе сувымярэння тэмпаў росту заработнай платы з тэмпамі росту прадукцыйнасці працы з тым, каб апошні паказчык перавышаў першы.

Аўтары канцэпцыі прапануюць таксама расшырыць практыку натуральнай аплаты працы работнікаў прадпрыемстваў і арганізацый.

РЭГУЛЯВАННЕ АПЛАТЫ ПРАЦЫ

Дзяржава з улікам магчымасцей сацыяльна-эканамічнага развіцця перыядычна павышае мінімальную заработную плату. Пры гэтым выкарыстоўваюцца сродкі, накіроўваемыя прадпрыемствамі і арганізацыямі на аплату працы, а бюджэтнымі арганізацыямі і ўстановамі — за кошт сродкаў бюджэту.

Канцэпцыяй прапануецца ўвесці ў практыку на ўсіх узроўнях кіравання, а таксама на прадпрыемствах і ў арганізацыях, у якасці альтэрнатывы адміністрацыйным метадам рэгулявання аплаты працы, сістэму тарыфных пагадненняў і калектыўных дагавораў. Для гэтага трэба завяршыць працэс фарміравання і кансалідацыі аб'яднанняў уласнікаў і іх прадстаўнікоў, уключаючы кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў і прадпрымальнікаў, паўнамоцных заключаць на раўнапраўнай аснове тарыфныя пагадненні з рэспубліканскімі галіновымі арганізацыямі прафсаюзаў, якія прадстаўляюць інтарэсы працоўных.

Калектыўныя дагаворы павінны стаць асноўным інструментам рэгулявання аплаты працы на ўзроўні прадпрыемстваў і арганізацый. У іх замацоўваюцца наступныя асноўныя палажэнні:

перыядычны перагляд ставак і акладаў, пры неабходнасці — форм і сістэм аплаты працы, а таксама сярэдняй заработнай платы на аснове рэалізацыі канкрэтных мерапрыемстваў па павышэнню эфектыўнасці вытворчасці;

парадак прымянення і памеры надбавак, даплат, у тым ліку кампенсацыйнага характару, прэмій і іншых відаў узнагароджання;

пытанні нарміравання і інтэнсіфікацыі працы, тарыфікацыі работ і работнікаў;

парадак ацэнкі працоўнага ўкладу работнікаў.

У далейшым прапануецца расшырыць сферу прымянення кантрактнай формы аплаты працы кіраўнікоў рознага ўзроўню кіравання і спецыялістаў прадпрыемстваў і арганізацый як вытворчай, так і невытворчай сферы.

Перабудова сістэмы фарміравання і выкарыстання грамадскіх фондаў спажывання, сацыяльнага страхавання, падаткаабкладання

Дзеючая сістэма размеркавання грамадскіх фондаў спажывання не адпавядае матывацыйнаму механізму рынкавых адносін і мэтам сацыяльнай палітыкі.

Паводле ацэнак спецыялістаў, да апошняга часу малазабяспечаная сям'я (з даходамі на аднаго члена ніжэй пражытачнага мінімуму) атрымлівала з ГФС выплат і льгот прыкладна ў 2 разы менш, чым сям'я з сярэднімі даходамі, г. зн. большая частка ГФС даставалася тым, хто займаў больш высокае месца ў сацыяльнай іерархіі.

Цяпер у рэспубліцы на выплаты і льготы з грамадскіх фондаў спажывання на асвету, ахову здароўя і ўтрыманне жылога фонду расходуецца прыкладна 2 млрд. руб. у год. Першапачаткова ў 1992—1993 гг. з'яўляецца магчымым скарачэнне гэтых расходаў з бюджэту прыкладна на 20—25 працэнтаў, што дазволіць павысіць мінімальную заработную плату на 4—5 працэнтаў.

У далейшым выплаты з грамадскіх фондаў спажывання могуць быць скарочаны яшчэ на адну чвэрць і, такім чынам, за кошт гэтай крыніцы мінімальная заработная плата павысіцца прыкладна на 10 працэнтаў.

Мяркуецца таксама зменшыць адлічэнні прадпрыемствамі і арганізацыямі сродкаў на сацыяльнае страхаванне прыкладна на 50 працэнтаў і адпаведна павялічыць фонд аплаты працы і ўвесці індывідуальнае сацыяльнае страхаванне работніка, крыніцай якога выступае яго заработная плата.

Рэгуляванне сродкаў, накіроўваемых на аплату працы, ажыццяўляецца шляхам падаткаабкладання даходаў (прыбытку) прадпрыемстваў і арганізацый у адпаведнасці з дзеючым у рэспубліцы заканадаўствам. Пры гэтым маецца на ўвазе перайсці да ажыццяўлення гібкай узгодненай палітыкі падаткаабкладання даходаў, прадугледзеўшы льготы і скідкі для тых з іх, хто выпускае прадукцыю па фіксаваных цэнах, новую высокаэфектыўную прадукцыю, інвесціруе развіццё і абнаўленне вытворчасці.

Дзеючы прагрэсіўны падаходны падатак, накіраваны на павелічэнне падатковай нагрузкі на высокааплатных грамадзян і зніжэнне яе на нізкааплатных, носіць супярэчлівы характар: з аднаго боку, ён з'яўляецца крыніцай даходу дзяржаўнага бюджэту, з другога — зніжае зацікаўленасць работнікаў у высокіх вытворчых выніках, паколькі па меры іх узрастання зніжаецца ўдзельны размер атрымліваемага ўзнагароджання. Таму ў перспектыве найбольш мэтазгодным з'яўляецца пераход да вылічэння падаходнага падатку зыходзячы з агульнага гадавога даходу грамадзян з усіх крыніц, замена прагрэсіўнага падатку прапарцыянальным, што дазволіць у найбольшай меры рэалізаваць прынцыпы сацыяльнай справядлівасці і ў той жа час рэзка знізіць ураўняльнасць.

БОЛЬШ ПАДРАБЯЗНА З КАНЦЭПЦЫЯЙ МОЖНА АЗНАЁМІЦЦА Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ КАМІТЭЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПРАЦЫ І САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ НАСЕЛЬНІЦТВА. ТЭЛЕФОН 26-68-86.

Друкуецца ў скарачэнні.

ФЛЮГЕРманія,

або Сваё крэсла бліжэй да...

Вяртаючыся да надрукаванага

Тое, што гісторыя двойчы вяртаецца на адно і тое ж месца, я ў прынцыпе ведаў. Тое, што вяртаецца так хутка, — для мяне адкрыццё.

Словам, так: 20 снежня г. г. «Советская Белоруссия» надрукавала карэспандэнцыю свайго спецкора М. Дыма «Незнаёмая «Дэметра». Для каго незнаёмая, а для мяне дык вельмі добра знаёмая. Старшыня сельскагаспадарчага кааператыва «Дэметра» са Смалявіцкага раёна Віктар Віктаравіч Трухан роўна паўтара года назад звярнуўся да нас за дапамогай. І мы вырашылі дапамагчы. І, мне здаецца, дапамаглі. Бо кааператыў, які збіраліся ціхенька прыкрыць, а супраць яго старшыні ўзбудзіць крымінальную справу, не закрылі, Віктара Віктаравіча пакінулі ў спакоі. Як памятаю, ён быў вельмі ўдзячны за «Вайну раённага маштабу» (гл. «Звязду», 1990, № 135 ад 15 чэрвеня), праўда, потым сваё меркаванне некалькі змяніў.

Кораценька, было так: кааператыў хацелі «задавіць», ён не ўпісваўся ў тагачасную сістэму каардынат раённай улады. Я потым назаву імёны і прозвішчы, цяпер жа — некалькі цытат з карэспандэнцыі калегі (загадзя адзначу: ён усё напісаў сумленна, ніякіх прэтэнзій).

«Аўтарытэтнае меркаванне. Каментарый начальніка раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання У. В. Бурдыкі:

— Тры гады назад «Дэметра» для нас была таямнічай незнаёмкай. Зараз гэта самастойнае падраздзяленне гучна заявіла аб сабе. Перавага новай формы гаспадарання ў тым, што рэзка павысілася прадукцыйнасць працы. Зямля тая ж — вынікі іншыя, больш важкія. Зарплата ў людзей — у адпаведнасці з іх укладам. Каб эфектыўна весці гаспадарку, нядаўна райвыканком выдаў кааператыву дзяржакт на бестэрміновае карыстанне зямлёй (371 гектар)». Крыху перарвёмся, каб нагадаць, што было паўтара года назад.

Вось вытрымка з пісьма В. В. Трухана на імя першага сакратара ЦК КПБ Я. Я. Сакалова, першага сакратара Мінскага абкома А. А. Малафеева, старшыні Дзяржаграпрома БССР Ю. М. Хусаінава (якія ўсё прозвішчы гучныя!), першага сакратара Смалявіцкага РК КПБ В. М. Лемеша: «Старшыня РАПА Бурдыка У. В. аб'явіў непрымірымую вайну. Пытаю — ці патрэбен раёну лубін? Абыдземся без твайго лубіну! Вось адказ. Я разумею: не падабаемся мы яму, але ж ніхто нас не пытае — ці падабаецца ён нам. Мы гатовы супрацоўнічаць з аграпромам. Яму напляваць на нас і размазаць. Прыедзе на землі кааператыва (маецца на ўвазе У. В. Бурдыка, — С. Ш.) — сапраўдны рэвізор, слова добрага не пачуеш...»

Пытанне: калі Уладзімір Віктаравіч гаварыў шчыра — раней ці зараз — пакінем пакуль адкрытым. Цяпер да месца — мае асабістыя ўражанні ад сустрэчы з ім і яшчэ адзін дакумент.

Канспектыўна даю пераказ гутаркі са старшынёй РАПА і яго намеснікам па эканоміцы У. Я. Красоўскім (на жаль, не ведаю, дзе ён зараз). Значыць: «Ідэя кааператыва належыць супрацоўнікам БелНДІ земляробства... Купцоў (кандыдат сельгаснавук, «рухавік» вучонай часткі праекта, — С. Ш.) і кампанія зразумелі, што можна «нагрэць» рукі... Я «купіўся» на іх авантуру... Яны нас скарылі магчымасцю рашыць бялковую праблему... Пасеялі лубін вельмі дрэнна... Прадаюць насенне па 13 рублёў за кілаграм... Калгас і раён нічога не маюць... Трухан прыцягвае да работ тэхніку з іншых арганізацый і сам плаціць (паспрабаваў бы не заплаціць! — С. Ш.)... Асноўная наша прэтэнзія: гэта не навуковая арганізацыя справы, а тыповае рвацтва...»

Каб у маіх апанентаў зусім ужо адпалі ўсялякія сумненні, нагадаю ім аб існаванні даведкі, складзенай па матэрыялах аграпромаўскіх «рэйдаў» У. Я. Красоўскім і асабіста ім падпісанай. Вельмі цікавая даведка, але, каб не стамляць увагі паважаных чытачоў, працытую толькі выбранае. Вось, скажам: «Стварэнне кааператыва «Дэметра» падрывае склаўшуюся сістэму аплаты працы і працоўную дысцыпліну ў калгасах і саўгасах раёна, паколькі ва ўказаным кааператыве ў асноўным прымяняецца дагаворная сістэма аплаты працы або сістэма тарыфных ставак, якая значна перавышае тарыфныя стаўкі ў гаспадарках раёна».

Ці (ну проста не магу не прывесці): «У дагаворы на арэнду калгас «Парыжская камуна» прадаставіў права кааператыву «Дэметра» на арандуемых землях ствараць садовыя таварыствы». Тут я доўга спрабаваў разабрацца — дзе, уласна, крымінал? А калі зразумеў, міжволі зарагатаў. Аказваецца, садовыя таварыствы на землях калгаса (не саўгаса!) — гэта і ёсць крымінал. Гэта адступленне ад арыгіналу (праўда, ніхто і ніколі яго не бачыў), ад крыніц, ад узору сацыялістычнай гаспадаркі, як яго разумелі ў Смалявіцкім РАПА таго часу. У сённяшнім упраўленні сельскай гаспадаркі так ужо не думаюць, зроблены разварот, рулі перакладзены і ў парусы дзьме спадарожны вецер. Як усё проста, нават душа радуецца за такую дзіцячую непасрэднасць.

«Але не толькі эканоміка гаворыць сама за сябе, — цытую далей «аўтарытэтнае меркаванне» У. В. Бурдыкі. — Паглядзіце, колькі добрага зрабіў кааператыў для сельскіх жыхароў, асабліва састарэлых. Бульбасаджалку ці капалку ім не трэба шукаць — агарод пасеюць, убяруць за сімвалічную плату кааператары. Трэба — падвязуць дроў, адвязуць збожжа змалоць на млын, не кажучы ўжо аб сенажацях, пашы, сотках. «Пры калгасе такі клопат людзі не адчувалі», — з падзякай адгукаюцца аб кааператыве сяляне вёскі Кальнікі. Яно сапраўды так. Вось, скажам, доўга пакутавалі людзі з дрэнным водазабеспячэннем. Нядаўна кааператарамі праведзены ў вёску водаправод. На чарзе будаўніцтва сучаснага пасёлка...»

Ну, проста цуд, а не кааператыў — з якога боку ні пагляздзі. Проста дзіўна робіцца, чаму гэта яго папракалі летась менавіта водаправодам, казалі — прыкрываюцца ім, а пра бедных «пейзан» вёскі Кальнікі (такіх зараз удзячных) у кабінеце т. Бурдыкі нават не памянулі? Загадкі, таямнічасць, змрок.

Ды і аб калгасах меркаванне Уладзіміра Віктаравіча не было такім ужо катэгарычным. Наадварот, хварэў, можна сказаць, душою за іх. Перажываў за «Парыжскую камуну», якую «аб'ягорваў» гэты «злачынны» кааператыў. І справядліва, і справядліва, Уладзімір Віктаравіч. Бо як вам, спецыялісту са стажам, было не бачыць, што такія вось «Дэметры» і падрываюць калгасна-саўгасны лад? Але ж зноў усплывае тое непрыемнае пытанне: калі сельскі камандзір раёна быў шчыры — калі «давіў» «Дэметру» ці калі яе ўсхваляе цяпер?

А ў мяне да сябе пытанне: ці варта быць такім злапамятным? Можа, палку перагібаю? Ну, падумаеш, мала хто што казаў, ці меркаваў, ці проста лічыў. Было і было. Што ж зараз рабіць? Ды і роля суддзі мне неяк не падабаецца. Хісткая яна. Сёння ты судзіш, заўтра — цябе. Аб гэтым і ў Бібліі сказана: «Не судите, да не судимы будете». Праўда, тут невялікі такі, але важны момант. Калі б справа датычыла асабіста мяне, натуральна, забыў бы, я чалавек даволі мяккі.

Іншая справа, калі гутарка заходзіць аб людзях, якім уручана ўлада (па сутнасці, не кантралюемая) над тысячамі людзей. Мне (і ўсім таксама) вельмі цікава: што за людзі намі кіруюць, чым дыхаюць, што могуць зрабіць, а чаго — не.

Я асабіста ведаю не апошняга ў раёне чалавека, які, атрымаўшы першы ж загад ГКЧП, сказаў падначаленым: «Што ж, будзем выконваць». Чалавек і зараз на сваёй пасадзе. І ўсе астатнія, хто яўна ці не падтрымаў путчыстаў. Інакш кажучы, хто намі кіраваў, той і працягвае кіраваць. І, што вельмі важна, ніхто, канечне, сваіх поглядаў не змяніў. Не дай Божа, новы пераварот, ды яшчэ пераможны (дапускаць трэба любую магчымасць) — што тады? Зноў возьмуцца за «Дэметру»? Зноў калгасы стануць адзінай «правільнай» формай, таму што ўсе «няправільныя» будуць знішчаны?

Трухан нарэшце знайшоў кансенсус з райвыканкомам. Як—я ведаю. Можа так і трэба. Галоўнае, атрыманы дзяржакт на бестэрміновае валоданне зямлёй. Віктару Віктаравічу, канечне, выкруцілі рукі, запатрабавалі разабрацца з заметкай у газеце «Свободные новости» (была такая за маім подпісам), якую нехта размножыў у выглядзе лістоўкі. Гэта ў райвыканкоме не спадабалася, натуральна, і Трухан з яго падачы пачаў патрабаваць абвяржэння, пагражаць судом. Ну, і не гэта галоўнае, нарэшце, я разумею: у такіх умовах пойдзеш на ўсё. Больш важная тактыка: у новых абставінах некаму хочацца выглядаць чыстым.

Абставіны новыя, а пасады старыя — губляць іх не хочацца з-за непрадуманых некалі крокаў. «А в остальном, прекрасная маркиза...», далей па тэксту. Жывём далей. Кіруем далей. Асноўнае — своечасова змяніць курс. Словы — яны і ёсць словы. Улада — справа іншая. Ці не так, Уладзімір Віктаравіч?

Сяргей ШАЎЦОЎ,
агляддальнік «Звязды».

Распрацоўкай праектаў пагранічных законаў Рэспублікі Беларусь на асноўных аўтамабільных дарогах заняты ў інстытуце «Белрамдарпраект». У архітэктурным вырашэнні знакаў выкарыстоўваецца дзяржаўная сімволіка нашай незалежнай дзяржавы.

НА ЗДЫМКУ: макеты пагранічных знакаў рэспублікі дэманструе начальнік архітэктурна-дызайнерскай майстэрні інстытута А. Сардараў.

Фота Уладзіміра МЯЖЭВІЧА. (БЕЛТА).

У нашых суседзяў

АВІЯЗРУЧНАСЦІ ТОЛЬКІ ЗА ВАЛЮТУ

У некалькі разоў хутчэй і зручней можна цяпер прыляцець у сталіцу Літвы. Паміж Вільнюсам і гарадамі Заходняй Еўропы адкрыты дзевяць новых рэйсаў. Прычым у Берлін пачалі лятаць самалёты не савецкай вытворчасці, а «Боінг 737-200» кампаніі «Летувас авіяліній». Гэтак жа проста з Вільнюса сёння трапіць у Франкфурт-на-Майне, Капенгаген, Варшаву... Праўда, плаціць за білеты трэба валютай.

БІРЖЫ — МЕЦЭНАТЫ

Сто тысяч рублёў на калядныя падарункі для дзяцей з дзіцячага дома ў Даўгаўпілкскім раёне пералічыла «Рыгас біржа». І гэта—не адзіная акцыя дабрачыннасці біржавікоў. На ліквідацыю вынікаў путчу работнікам Латвійскага радыё і тэлебачання накіраваны мільён рублёў. Усяго ж на дабрачынныя мэты з ліпеня гэтага года «Рыгас біржа» пералічыла два з палавінай мільёны рублёў.

Пасля першых таргоў, якія прайшлі ў сярэдзіне верасня, і латвійская універсальная біржа палічыла для сябе абавязковым выкарыстаць частку выручаных грошай на дабрачынныя мэты. Нямала сродкаў накіравалі біржавікі ў Латвійскі дзіцячы фонд, таварыству «Ратуйце дзяцей», Латвійскаму таварыству інвалідаў. Латвійская універсальная біржа дапамагла студэнтам універсітэта ў выданні маладзёжнага студэнцкага часопіса.

100 БРОКЕРАЎ — ГЭТА МІНІМУМ

Біржы ў Латвіі растуць, як грыбы пасля дажджу. Цяпер іх ужо каля дваццаці. Толькі дзейнічаюць яны галоўным чынам у інтарэсах расійскага рынку. У рамках Латвіі заключана ўсяго каля 30 працэнтаў здзелак.

Савет Міністраў Латвіі на чарговым пасяджэнні пастанавіў да прыняцця закона аб біржах спыніць рэгістрацыю новых бірж. Ужо існуючыя біржы да 20 лютага будуць яшчэ раз перарэгістраваны, калі яны прадставяць умовы біржавой дзейнасці і калі ў іх будзе не менш ста брокераў. Іншыя біржы павінны будуць пераўтварыцца, напрыклад, у гандлёвыя дамы.

(БЕЛТА).

«Нельга ўявіць незалежнасць Беларусі без юрыдычнага забеспячэння»

Цяпер шмат гаворыцца і пішацца пра нашу незалежнасць, але неяк вельмі ўжо марудна ўсталёўваецца яна на самай справе. Катастрафічна, і гэта не з'яўляецца асаблівай навіной, не стае прафесійных парламентарыяў, эканамістаў, юрыстаў. Апошнія ўвогуле вылучаюцца на першы план у сувязі з такім хуткім развіццём палітычных падзей на Беларусі. Ніводная дзяржава не можа абысціся без сваіх прадстаўніцтваў і консульстваў у сябе і за мяжой, без усебаковага абгрунтавання ў адпаведнасці з усімі юрыдычнымі нормамі і правамі сваёй незалежнасці.

Юрыдычны факультэт Белдзяржуніверсітэта з'яўляецца асноўнай кузняй юрыстаў - прафесіяналаў, і таму без пільнай увагі да юрфака і яго праблем сапраўды цяжка будзе гаварыць аб прававым забеспячэнні нашага суверэнітэту. З гэтага і пачалася гутарка з дэканам юрфака Валерыем ГАДУНОВЫМ.

— Нядаўна наш факультэт наведаў міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Пётр Краўчанка. Яго візіт быў невыпадковым. МЗС зацікаўлена ў павелічэнні выпуску прафесійных юрыдычных кадраў, якія могуць прадстаўляць і абараняць інтарэсы рэспублікі на міжнародным узроўні.

Плануецца адкрыццё пасольстваў, прадстаўніцтваў Беларусі ў іншых краінах. Без выхаванцаў юрфака ў гэтым выпадку ніяк не абысціся.

Мы ж у сваю чаргу чакаем ад Міністэрства замежных спраў больш пільнай увагі да нашых праблем. Менавіта ў міністэрства павінна балець галава аб стажыроўцы нашых студэнтаў за мяжой, без якой цяжка ўявіць прафесійнага юрыста, працуючага ў сістэме МЗС. Дзе ўзяць валюту? Тут (і са мной, думаю, пагодзіцца пераважная большасць) «эканомія» матэрыяльных сродкаў абернецца немалымі стратамі менавіта для ўсёй Беларусі.

— І ўсё ж, што робіцца самім юрфакам для таго, каб адпавядаць патрабаванням часу?

— Абмежаваліся пакуль стварэннем на юрфаку новай спецыялізацыі: міжнароднае права і прававое забеспячэнне знешнеэканамічнай дзейнасці. Многія выпускнікі гэтай спецыялізацыі будуць працаваць у сістэме МЗС на тэрыторыі рэспублікі ці ў яго прадстаўніцтвах за мяжой. Студэнты ж новай спецыялізацыі павінны выдатна валодаць беларускай, мінімум адной замежнай мовай і добра—рускай.

Мы не лічым гэта радыкальным рашэннем у плане задавальнення патрэб рэспублікі ў юрыстах - міжнародніках, але адсутнасць вучэбных плошчаў не дазваляе нам пакуль гаварыць аб большым. На кожнага студэнта факультэта не знойдзецца і аднаго метра вучэбных плошчаў. Згадзіцеся, у такіх умовах цяжка марыць аб нечым большым. Хоць хадзіла і ходзіць шмат размоў аб перадачы універсітэту (у тым ліку і юрфаку) пэўнай часткі карысных «партыйных» метраў, але пакуль што паляпшэння ў гэтым плане я не бачу. Таму адкрыццё ў нас аддзялення міжнароднага права пад вялікім пытаннем.

— Валерый Мікалаевіч, вы закранулі пытанне беларусізацыі факультэта.

— З наступнага года на кожным факультэце ствараюцца два аддзяленні: беларускамоўнае і рускамоўнае. На першым усе дысцыпліны будуць выкладацца па-беларуску, і, канешне, без добрага ведання беларускай мовы абітурыенту на гэтым аддзяленні не абысціся. Ужо цяпер на І курсе студэнты вывучаюць родную мову. Многія нашы выкладчыкі вывучаюць яе таксама на агульнауніверсітэцкіх курсах.

— Няма асаблівага сакрэту ў тым, што цяпер у многіх навучальных установах востра стаіць праблема выкладання гуманітарных дысцыплін.

— У гэтым плане мы, юрысты, усё ж былі і застаёмся ў больш прывабным становішчы, чым іншыя гуманітарныя ўстановы. Мы вывучалі і вывучаем у першую чаргу гісторыю права, а потым ужо гісторыю партый, краіны, рэвалюцыйных рухаў і г. д. Хоць без пераарыентацыі на агульначалавечыя каштоўнасці нам таксама не выжыць. Калі раней сцвярджалася, што наша права — самае лепшае і гуманнае, накіраванае на абарону інтарэсаў савецкага чалавека, то цяпер прама даводзіцца гаварыць, што гэта не так, што наша права часта выкарыстоўвалася для падаўлення іншадумства, абмежавання правоў і свабод чалавека ў краіне.

— Гэта зразумелі і асэнсавалі вы і, мусіць, большая частка выкладчыкаў факультэта. Але ёсць, напэўна, на факультэце і дагматыкі?

— Ведаеце, у гэтым плане нейкіх асаблівых праблем я не бачу. Тым, хто не захоча зразумець і асэнсаваць, прыйдзецца пакінуць факультэт. Цяпер немагчыма без новага падыходу выкладаць свой прадмет — цябе проста не будуць паважаць тыя ж студэнты.

— Некаторыя з іх адразу ж пасля заканчэння вашага факультэта атрымліваюць у некалькі разоў больш, чым дэкан юрфака.

— Нядаўна я недзе прачытаў аб'яву: «Патрабуецца сантэхнік. Аклад 1.100 рублёў. На працягу паўтара-двух гадоў прадастаўляецца службовая жылая плошча».

Аклад выкладчыка універсітэта — 450 рублёў, дацэнта — 690, прафесара — 970.

Калі я ў 1974 годзе пачынаў сваю выкладчыцкую дзейнасць, то атрымліваў 125 рублёў. Але ж на гэтыя грошы можна было жыць! А цяпер... Крыўдна не за сябе, крыўдна за дзяржаву. З такім падыходам да вышэйшай адукацыі можна і трэба чакаць яшчэ большага пагаршэння ва ўсіх сферах нашага жыцця.

Як можна зразумець рашэнне Вярхоўнага Савета рэспублікі аб тым, каб заработную плату выкладчыкаў ВНУ зрабіць да 1994 года ў паўтара раза большай, чым у служачых прамысловасці? А што загадаеце рабіць прафесарска-выкладчыцкаму саставу ў гэты перыяд?

Таму зараз моладзь неахвотна ідзе ў аспірантуру. Раней можна было спадзявацца на нейкую будучыню. Цяпер жа...

— І тым не менш факультэт застаецца самым прэстыжным месцам вучобы, куды практычна немагчыма трапіць простаму чалавеку.

— Быў. Цяпер просты чалавек, на мой погляд, можа стаць студэнтам юрфака. Вядома, калі ў яго ёсць добрыя веды.

Прахадны бал да гэтага года быў 15 з 15 магчымых. Таму мы і пайшлі на наваўвядзенне — аб'явілі матэматыку прафілюючым прадметам на ўступных экзаменах. Прахадны бал адразу ўпаў да 13, і веры ў свой студэнцкі білет дабавілася ў многіх абітурыентаў. Хоць гэтае рашэнне нам далося вельмі нялёгка. Я адчуў, што і сёння быць рэфарматарам — некалькі небяспечная справа. Довад «Навошта матэматыка на гуманітарным факультэце?» меў не так ужо мала прыхільнікаў. У гэтым плане мы — першыя ў Саюзе. Нешта падобнае ёсць у Ташкенцкім універсітэце. Але там матэматыка здаецца факультатыўна: залік — незалік.

Між іншым, за мяжой у пераважнай большасці юрыдычных навучальных устаноў матэматыцы ўдзяляецца вялікая і зразумелая ўвага. Каб быць юрыстам, мала ведаць закон і права, трэба добра валодаць камп'ютэрнай граматай, быць «падкаваным» у галіне бізнесу. А ўсё гэта немагчыма без добрага ведання матэматыкі. Дарэчы, да нас пераўёўся студэнт з юрфака Уланбатарскага універсітэта. Дык вось: у яго залікоўцы сярод іншых вывучаемых прадметаў я са здзіўленнем убачыў і матэматыку.

— Валерый Мікалаевіч, юрфак — мусіць, адзіны факультэт БДУ, за вучобу на якім згодны плаціць немалыя грошы...

— Я не прыхільнік платнага навучання на факультэце. Правазнаўцы патрэбны дзяржаве, і хай яна плаціць за іх вучобу. Іншая справа, калі ў нашых спецыялістах зацікаўлены нейкія прадпрыемствы, камерцыйныя структуры. Цікавасць да іх у студэнтаў, дарэчы, вельмі вялікая. Калі раней з наборам на гаспадарча-прававую спецыялізацыю заўсёды былі праблемы, то цяпер наадварот.

Калі нехта хоча «заказаць» выпускнікоў нашага факультэта, хай плаціць грошы за вучобу, забяспечвае вучэбнымі плошчамі і неабходнай тэхнікай, — мы са свайго боку заўсёды пойдзем насустрач.

На чым я настойваю, дык гэта на тым, каб умовы ўступных экзаменаў былі роўныя для ўсіх: і для «дзяржаўных», і для «камерцыйных» абітурыентаў.

Гутарыў
Аляксандр КОКТЫШ.

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ АД 18 ДА 18 СУТАК

НАЧНАЯ ТРАГЕДЫЯ

Цяжкая трагедыя адбылася ў Барысаве — ноччу загарэўся дом па вуліцы Пірагова. Ахвярамі агню сталі чатыры чалавекі—трое маленькіх дзяцей, старэйшаму з якіх 4 гады, і гаспадар дома — іх бацька. Двайм — маці і малодшаму сыну— удалося выратавацца. Прычыны пажару высвятляюцца.

ГЭТА ЗДАРЫЛАСЯ Ў БАРЫСАВЕ

Паводле водгукаў з гэтага горада, будуюць туркі тут добра і хутка. А вось правілы дарожнага руху, відаць, дрэнна засвоілі. Так сцвярджаць дае падставы трагедыя, якая здарылася ў Барысаве 24 снежня. Турэцкі грамадзянін К. А., шафёр будаўнічай фірмы «Эйка», кіруючы аўтамабілем «Мерседэс-Бенц», пры руху заднім ходам наехаў на свайго земляка Х. К., і той у выніку памёр.

«Агенцтва РІД».

ЯКОЕ ЯНО ЖЫЦЦЁ!?

НЯШЧАСЦЕ ПЕРАСЯКАЕ МЫТНІ



Рака хуткаплыннага часу выкінула нас, зусім нядаўна не жадаючых ведаць пра што-небудзь непрывабнае, на суровую водмель жыцця. І ўбачылі мы, што ёсць сіратлівыя і ўбогія, хворыя і бездапаможныя. А яны, убачыўшы, што мы ўжо ведаем, зараз жа абступілі нас натоўпам.

Асобы без пэўнага месца жыхарства, старыя жабракі, пенсіянеры, [illegible] трэція проста так жывуць. Каля пяці тысяч у год прыходзіць у Фонд міласэрнасці: ім даюць адзенне, талоны на харчаванне, купляюць білеты да месца жыхарства. Але іх не становіцца менш. Нягледзячы на граніцы, што ўстанавіліся паміж былымі рэспублікамі Саюза, няшчасце перасякае мытні і чакае выратавання па-ранейшаму ў буйных гарадах [illegible]

НА ЗДЫМКУ: няпроста падаць руку за міласэрнасцю.

Фота Алексея СЯНЦОВА.

БелаПАН ПАВЕДАМЛЯЕ:

«МІНСК»— ГЭТА НЕШТА ІСПАНСКАЕ

25 снежня адбылося пасяджэнне ініцыятыўнага камітэта па стварэнню Беларуска-іспанскага культурна-асветніцкага таварыства.

Яно, як плануецца, будзе займацца пытаннямі культурных і навуковых сувязей, а таксама бізнесам, садзейнічаць развіццю турыстычных сувязей паміж дзвюма дзяржавамі. [illegible] на Беларусі дзейнічаюць 134 школы, у якіх у якасці замежнай мовы вывучаецца іспанская, а Мінскі інстытут замежных моў рыхтуе высокакваліфікаваных перакладчыкаў з іспанскай.

Выпускнікі менавіта гэтай ВНУ першымі з савецкіх перакладчыкаў трапілі на працу ў Іспанію пасля ўстанаўлення дыпламатычных зносін паміж СССР і гэтай краінай [illegible] назва якога — «Мінск». [illegible] Садружнасці Незалежных Дзяржаў. [illegible] ку становіцца [illegible] — менавіта ў Мінску знаходзіцца цэнтр Садружнасці.

У ініцыятыўны камітэт увайшлі прадстаўнікі таварыства «Радзіма», [illegible]

ШТО Ж ЗА ШЛЯХТА БЕЗ СВАЁЙ ЗЯМЛІ?

Старшыня Беларускага саюза шляхты (дваран) Пётр Гушча паведаміў карэспандэнту БелаПАН, што саюз мае намер звярнуцца ў Вярхоўны Савет Беларусі і Саўмін рэспублікі з тым, каб беларускай шляхце вярнулі зямлю.

— Што ні кажыце, — працягвае пан Гушча, — а ў 17-м годзе нас абрабавалі добра. Я думаю, нашчадкі тых, у каго бальшавікі адабралі зямлю, маюць права на 50 гектараў [illegible] пакуль, відаць, давядзецца задаволіцца [illegible] князя Далгарукава [illegible] гектараў [illegible] Ліманцы.

Князь прапанаваў [illegible] 10 соткаў.

ВАС ЧАКАЕ СЮРПРЫЗ

Прынесці 1. І. просім пазваніць па тэлефоне 32-43-03. [illegible]

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА.

ЗАМЕСТ ЮШКІ... СОШКІ?

БРЭСТ. У мясцовых рыбакоў радасць: капрызнае надвор'е ўсё ж дало магчымасць папаўняць свае сілы ў падлёдным паляванні. [illegible]

І вось, калі некалькі брэстаўскіх рыбакоў [illegible] гранатамёта.

Прычым зусім новы, нават з нумарам Н410. Спробы знайсці сам гранатамёт [illegible] пакуль не прывялі. Распачата следства.

«РОБІН ГУДЫ» Ў СПАДНІЦАХ

Зноў далі аб сабе знаць "Робін гуды" ў спадніцах. У 13 гадзін дня ў грамадскім туалеце ў Міхайлаўскім скверы па вул. Бабруйскай чацвёра невядомых дзяўчат пад пагрозай фізічнай расправы адабралі ў жыхаркі г. Барысава, якая знаходзілася ў Мінску праездам, залатыя завушніцы. Пацярпеўшая звярнулася ў міліцыю толькі праз тры дні. Ідзе пошук. [illegible]

«СТАНАЎЛЕННЕ» ПРАХОДЗІЦЬ ХУТКА

У наш бурны час хутка [illegible] браты Міхаіл і Яўген К., [illegible] «Разборка» праходзіла [illegible]

Выпуск падрыхтавалі І. КАРНЕЙ, А. КОКТЫШ, А. СЛАНЕЎСКІ, С. СУЛКОЎСКІ, І. ШЧУЧЭНКА. Нашы тэлефоны: 32-44-02, 32-60-13, 32-31-98.

«ПЛАСТЫ НОВЫХ РЭАЛІЙ ВЫМУШАЮЦЬ ДА РЭФАРМАЦЫІ ЎСЁЙ САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

— Зразумела, пры ўмове станоўчага выніку калектыў выйграе. Толькі ж рызыка ў навуцы нярэдка абарочваецца і няўдачай: тады што — поўнае банкруцтва, гібель лабараторыі, часовага творчага калектыву або і цэлага інстытута?

— Кожны канкрэтны выпадак патрабуе свайго аналізу. Аднак у прынцыпе можна спадзявацца і на дапамогу дзяржаўнага бюджэту. На маю думку, вельмі многім калектывам беларускіх вучоных нявартa палохацца, асцярожнічаць — ім пад сілу не толькі браць крэдыты і вяртаць іх, але і спадзявацца на значныя даходы.

— Крэдыт і конкурс — галоўныя, такім чынам, рычагі ў прыкладной навуцы. Але гэта, мабыць, не ўсё?

— **У перспектыве мы павінны мець у сябе ўсе атрыбуты афармлення свайго навуковага, інтэлектуальнага патэнцыялу.** Тут — і вышэйшая атэстацыйная камісія, і патэнтны, ліцэнзійны дэпартаменты, і інш. Раней як? Доктар навук, скажам, абараняў сваю дысертацыю ва універсітэце, савет адсылаў яе ў ВАК, дзе і вырашаўся лёс дактаранта. Цяпер схема іншая: адпаведна спецыяльнасцям вызначаюцца галаўныя саветы, ВНУ або інстытуты Акадэміі навук, якія ўжо мелі і маюць высокую ступень даверу да сваёй кваліфікацыі, навуковай аб'ектыўнасці. Вось вам і апошняя інстанцыя па выдачы дыпломаў. Канешне, ахапіць увесь спектр не ў нашых сілах, ды і няварта імкнуцца да ўсёахопнасці—гэта абавязкова ў рэшце рэшт зніжае планку патрабаванняў да сертыфікацыі дыпломаў. Таму прадугледжваем таксама адпаведную кааперацыю з «зоркамі» Маскоўскага універсітэта, той жа «бауманкі», з заходнімі аўтарытэтамі.

— Ці ёсць свежыя прыклады падобнага супрацоўніцтва?

— На чале ўрадавай дэлегацыі нядаўна я быў у Германіі. Дык вось, наша Беларуская політэхнічная акадэмія стварыла сумеснае прадпрыемства з вядомай нямецкай фірмай «Ферашталь». Праз сваё прадстаўніцтва ў акадэміі яна будзе вывучаць рынак нашых ідэй, ліцэнзій і дапамагаць у іх даводцы да таварнага выгляду і рэалізацыі на Захадзе.

Між іншым, я глыбока перакананы: **патэнтна-ліцэнзійны абмен або гандаль — адзіная рэальная сёння магчымасць пачаць узаемавыгадны дыялог з Захадам.** Такая схема павінна спрацаваць і на рэспубліканскім узроўні. Паступова **яна забяспечыць прывязку да інтэграцыі Беларусі ў еўрапейскую эканоміку.**

— Гэта стратэгія патрабуе, мабыць, каардынацыі на дзяржаўным узроўні?

— Так, мы ствараем свой Камітэт па навуцы і тэхналогіях.

— Міхаіл Іванавіч, вы абмінулі ў разважаннях гуманітарную сферу. Хіба тут менш праблем?

— Не, проста тут асобная вялікая размова. Не хочацца многа гаварыць аб агульнавядомым. Але заўважу наступнае. Зараз гуманітарная навука робіцца не ў звыклых афіцыйных структурах. Акцэнт у распрацоўцы грунтоўных гуманітарных праблем зрушваецца на часовыя творчыя калектывы, яны ж ствараюцца, як кажуць, і на голым месцы — пад ідэю. **Адметнасць моманту ў тым, каб не толькі не страціць традыцыйныя славянскія набыткі ў навуцы, але развіць на іх базе даследаванні чыста нацыянальнай, беларускай праблематыкі.** У гэтым сэнсе зараз многае робіцца, прыгадаем хоць бы створаныя нядаўна нацыянальныя асветніцкія цэнтры...

Асаблівую ўвагу звяртае на сябе сфера гісторыі. Нам зусім па-новаму трэба асэнсаваць асноўныя рубяжы развіцця нацыі. Трэба зрабіць добрую аснову для незваротнага ўзмацнення ідэі і самога працэсу станаўлення беларускай дзяржаўнасці—гісторыя павінна «страляць» у будучыню. А для гэтага неабходна змяніць пункт гледжання на мінуўшчыну, на тыя ж узаемаадносіны Беларусі з Літвой, Расіяй, Украінай, Польшчай, Латвіяй... Да таго вымушае хоць бы абвостраная сённяшнімі рэаліямі праблемы дзяржаўных межаў, узаемадзеяння народаў, этнасаў... Пласт тых навуковых вузлоў і вузельчыкаў на факультатыўным узроўні не падняць, яны вымушаюць **да рэфармацыі ўсёй гістарычнай навукі.**

— Праілюструйце, калі ласка, сказанае нейкім прыкладам?

— Нядаўняя сустрэча з навукоўцамі Гродна ўмацавала мяне ў думцы, што менавіта мясцоваму універсітэту трэба аддаць прыярытэт у аналізе ўзаемаадносін Беларусі з Літвой і Польшчай. Гляньце: 20 працэнтаў палякаў жыве менавіта там. Вось вам і сапраўдны палігон для вырашэння найвастрэйшай праблемы, навошта адцягваць яе вывучэнне ў Мінск? Тое ж самае тычыцца падыходу да так званай «яцвяжскай праблемы» — няхай ёю больш займаюцца ў Брэсце, нават у Пінску.

— Размову можна весці не толькі пра новую навуковую геаграфію, але і пра новыя навуковыя імёны?

— Заўвага да месца. Па ўсім бачна, напрыклад, што сучасныя патрабаванні яшчэ больш выразна раскрываюць творчы дыяпазон таго ж Міхася Ткачова...

— Міхаіл Іванавіч, дазвольце перайсці ад навукі да яе роднай сястры — адукацыі: тут таксама не абысціся без новых падыходаў?

— Наколькі гэта магчыма ва ўмовах эканамічнага крызісу, яна ўжо цяпер рэфармуецца самым карэнным чынам. Галоўны накірунак — стварэнне новых навучальных устаноў сярэдняга тыпу: ліцэяў, гімназій і г. д. Тут больш пераймаецца набытак менавіта славянскі, расейскі. Тут ёсць той «агонь», якога няма ў краінах Захаду. Дарэчы, іх эксперты па стварэнню сістэм адукацыі гавораць, што гэты вопыт трэба пераняць менавіта ім. Аднак што датычыць прафесійнай, а не агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі, то, у сваю чаргу, ужо нам, славянам, трэба арыентавацца на замежжа, перш за ўсё на вопыт Германіі, Англіі, Францыі, Швейцарыі. Так, між іншым, яно і робіцца. Маю на ўвазе каледжы, гібрыдныя ўстановы прафесійнага тыпу, у тым ліку і ВНУ. **З новага навучальнага года адбудзецца пераход на двухузроўневую вышэйшую падрыхтоўку — бакалаўраў і магістраў.** Ставіцца задача, каб магістр мінскі адпавядаў узроўню падрыхтоўкі магістра оксфардскага. Гэтага, зразумела, дасягнуць цяжка — розныя ўмовы. Таму, каб не скампраметаваць перспектыўную ідэю спешкай, абмяжуем пераход на новую сістэму спачатку ўсяго толькі некалькімі спецыяльнасцямі ў тых інстытутах, дзе могуць на практыцы забяспечыць патрабуемы ўзровень.

Тут да месца нагадаць таксама ідэю стварэння беларускага міжнароднага інстытута менеджменту з філіяламі ў абласцях. Адпаведныя перагаворы вядуцца з зацікаўленымі арганізацыямі, размешчанымі ў Германіі.

— Якія прыклады ёсць яшчэ?

— Па адной ці нават некалькіх машынабудаўнічых спецыяльнасцях гатова інтэгравацца з еўрапейскімі цэнтрамі Беларуская політэхнічная акадэмія. У галіне мікраэлектронікі можа дазволіць сабе раскошу такога эксперыменту радыётэхнічны інстытут. БТІ мае шанц сысціся з фінскімі калегамі ў падрыхтоўцы спецыялістаў па кансервацыі помнікаў драўлянай архітэктуры.

— Сапраўды, ідэя прынцыпова новая...

— Што асабліва важна, дык гэта магчымасць аўтаматычнай інтэграцыі сістэмы нашай адукацыі ў заходнееўрапейскую. Важна толькі вытрымаць на справе прынцыпы і патрабаванні.

— Такая задача, у прыватнасці, змяняе крытэрыі адбору абітурыентаў?

— Ён будзе на карысць аб'ектыўна здольнай моладзі. Гэта і пераможцы сур'ёзных алімпіяд, і лепшыя выпускнікі ліцэяў, гімназій — менавіта ім быць першапраходцамі, піянерамі заўтрашняй сістэмы, ім належыць узарваць існуючую практыку вышэйшай школы.

— Пяройдзем ад «а» да «б»: маем на ўвазе следам за прыёмам — размеркаванне будучых пяцікурснікаў...

— Тут асобая роля належыць дакладнай рабоце сістэмы індывідуальных дагавораў. Мае студэнт добрыя поспехі — яго заўважае фірма і... Аднак за ручку ніхто вас вадзіць не стане, вы павінны дакладна ведаць: прыйшоў вучыцца — вучыся, каб табой зацікавіліся, інакш... Дарэчы, пры двухузроўневай падрыхтоўцы само сабой адпадае шмат наноснага, суб'ектыўнага, напрыклад, такая сацыяльная загана, як блат.

І яшчэ. Гаворачы аб інтэграцыі адукацыі ў Заходнюю Еўропу, нельга забывацца пра моўную падрыхтоўку студэнтаў. Добрае практычнае валоданне выпускнікамі англійскай, французскай, нямецкай ці іспанскай мовай, незалежна ад спецыяльнасці, — абавязковае патрабаванне!

— Ну, а родная — беларуская?

— **Ідэя беларусізацыі ў любым выпадку па-за канкурэнцыяй. Бо яна заклікана кансалідаваць інтэлігенцыю, нацыю,** што і павінна добра адчувацца на практыцы. У гэтым сэнсе я дапускаю нават пэўны ціск на асобу з боку дзяржавы. Але нам усё роўна не дабіцца перамогі, калі мы, прабачце за высокі стыль, не пойдзем у народ. Людзям неабходна растлумачыць ідэю-аксіёму: Беларусь здольная выжыць толькі як нацыя самабытная, нацыя адметная, са сваёй мовай, гісторыяй, няспынна шліфуемай культурай...

— Многія, між іншым, лямантуюць, што ў нас і культуры такой, маўляў, няма, і мова адмерлая, накшталт лацінскай...

— Чую, чую... Таму і кажу: патрэбны «народнікі» — па-руску кажучы, «подвижники высокой идеи». **Уся сусветная гісторыя ўзводзіць нацыянальны фактар у ранг, паўтараю, філасофскай аксіёмы; нацыянальная ідэя — галоўны стрыжань усіх нашых дзеянняў.** Вось і сёння — гляньце наўкола — менавіта яна гуртуе людзей, бо няма іншай больш прыцягальнай сілы.

— Вы не баіцеся папрокаў у нацыяналізме?

— Не. Бо казаў і кажу, што адначасова самым належным чынам трэба ставіцца да праблемы нацыянальных меншасцей, што ёсць у рэспубліцы. І ўсё ж трэба ствараць абстаноўку, пры якой выразна адчуваецца: дзяржаўная мова на Беларусі — беларуская, можа, у перспектыве мова міжнацыянальных зносін на нашай тэрыторыі — зноў жа беларуская... Як бы там ні было, я думаю, ідэя беларусізацыі выйдзе наперад існуючай сёння, напрыклад, польскай праблемы — гэта аб'ектыўная рэальнасць.

— Нейкім чынам мы зноў закранулі міжнародныя гуманітарныя праекты. Вы пакуль казалі пра іх у пэўным ідэалагічным ключы, але ж існуюць і эканамічныя аспекты гэтай праблемы?

— Бясспрэчна, аднак самі тыя праекты якраз і павінны ісці наперадзе эканомікі. **Бо няма ніводнай устойлівай міжнароднай эканамічнай праграмы, папярэднюю прастору якой не забяспечвала б адпаведная гуманітарная праграма.** І калі мы будзем, хочам ісці ў Заходнюю Еўропу мэтанакіравана, то павінны разумець менавіта вось гэтую паслядоўнасць. Нагадайце хаця б пагадненне з фірмай «Ферашталь»: яно грунтуецца на нашых ідэях, забяспечаных нямецкімі маркамі. Дык вось: на першым этапе супрацоўніцтва з замежжам асноўнай «валютай», асноўнымі дасягненнямі ў галіне эканомікі будуць менавіта агульныя праграмы па навуцы. Гэта ж пацвярджае вопыт супрацоўніцтва з Германіяй, яе зямлёй Паўночны-Рэйн-Вестфалія. Пакуль мы працуем на прынцыпах, абумоўленых у спецыяльным пагадненні, але далей мяркуецца падпісаць дагавор, раўнацэнны дагаворам з Расіяй, Украінай, Літвой... Добрыя перспектывы намячаюцца з Галандыяй, Францыяй.

— Аднак за ўсімі гэтымі добрымі перспектывамі нельга не бачыць вельмі сур'ёзнай праблемы — як мы абаронім свой інтэлектуальны патэнцыял ад поўнай, на корані, яго куплі тым жа Захадам?

— Няма на свеце больш «дзіўнай» дзяржавы, чым наша, калі мы рыхтуем таленавітага хлопца, а ён потым з'язджае ад нас, нічога не даючы Бацькаўшчыне ўзамен. **Як паветра неабходны закон аб абароне інтэлектуальнай уласнасці,** гэтага галоўнага атрыбута «мазгавога» патэнцыялу рэспублікі. Закон вызначыць, на якіх умовах наш спецыяліст мае права выехаць, на якіх умовах нашы ліцэнзіі могуць быць куплены — адным словам, патрэбен рэгламент выкарыстання носьбітаў інтэлекту.

Будзем рэалістамі: зараз, калі жыццё такое цяжкае, многія літаральна ірвуцца за мяжу з-за поўнай адсутнасці ўмоў для сваёй працы, сям'і — іх трэба зразумець. Разам з тым мы павінны правесці своеасаблівую «рэвізію» абставін жыцця кожнага нашага талента, асабліва тых, хто вось-вось на падыходзе да «крамольнай» думкі: «А-а, гары яно гарам, кіну ўсё і з'еду!» Трэба стварыць яму ўмовы для плённай працы і добрага жыцця тут, дома, на карысць новай Беларусі, яе народа. Гэта не проста высокія словы — гэта патрабаванне часу.

Ну, а калі нельга вырашыць праблемы, стаіць чалавек на сваім — не трэба абражаць яго варожасцю, падазронасцю: такое наша жыццё... Яно мудрае: упэўнены, што праз год-два многія і многія з «уцекачоў паняволі» вернуцца назад. Бо калі мы будзем мэтанакіравана будаваць цывілізаванае грамадства, то праз нейкае пяцігоддзе ўсе заўважаць: тут ствараецца моцная сучасная дзяржава. Вось тады пачнецца зваротны працэс — таленавітыя беларусы пададуцца на сваю Бацькаўшчыну, радзіму сваіх прашчураў... Ну, а пакуль не трэба рабіць трагедыі з «эміграцыі мазгоў», хоць і недаацэньваць маштабу пагрозы для нацыі таксама нельга.

Наспеў час падумаць аб стварэнні сістэмы ўзмацнення і абароны інтэлектуальнага патэнцыялу рэспублікі. Гэта, нагадаю, і Камітэт па навуцы, і звод адпаведных законаў, і дэпартамент ліцэнзійна-патэнтнай службы, і свая вышэйшая атэстацыйная камісія... Контуры такой сістэмы праглядваюцца — мы не стаім на месцы, крочым наперад, па вызначаных арыенцірах.

— Ёсць, адным словам, падставы для аптымізму?

— А як жа інакш, калі ёсць паўнацэнная нацыя з вясёлкай самых яркіх і розных талентаў! Ім пад сілу адужаць вызначанае.

Святаслаў БУЛАЦКІ, Аляксандр УЛІЦЁНАК.

Некалькі інтэрв'ю з нагоды наваселля

Яно пачалося днямі ў вёсцы Шарэйкі, на цэнтральнай сядзібе калгаса «Расія» Касцюковіцкага раёна. Узвялі жыллё для перасяленцаў з забруджанай зоны падрадчыкі з трэста «Белэнергабуд».

Як ставяцца да гэтай падзеі самі навасельцы, мясцовыя жыхары, удзельнікі будаўніцтва? Прадастаўляем слова некаторым з іх.

М. ЛЯОНАВА, дырэктар саўгаса «Брацкі», працаўнікі якога перасяляюцца ў новы пасёлак:

— Дзве нашых гаспадаркі хутка аб'яднаюцца ў адным калгасе. Людзі з «Брацкага», вядома, задаволены, што будуць жыць у новым пасёлку. Мяркуйце самі: на старой саўгаснай сядзібе, у вёсцы Брацькавічы, узровень радыеактыўнага забруджвання ў некаторых месцах складае да 30 кі/км², а тут натуральны фон — усяго 0,03 кюры.

Ужо з'явіліся і перасяленцы — першымі зняліся з месца наш старшыня прафкома Васіль Матарэнка і шафёр Мікалай Кірыенка. Яны атрымалі адпаведна трох- і чатырохпакаёвыя кватэры. Наогул, думаецца, скаргаў на новае жыллё не будзе: і шматпавярховыя дамы, і асобныя катэджы — усе яны маюць даволі прывабны выгляд.

Прызнаюся: дырэктар саўгаса я яшчэ малады. Пакуль невядома, кім мяне выберуць на новым месцы, у калгасе: неабавязкова ж быць толькі начальнікам. Затое ведаю, што без работы не застануся, паколькі маю спецыяльнасць заоінжынера, ды і наогул шмат чаго магу рабіць у жывёлагадоўлі. А муж, Васіль Аляксандравіч, ужо ўладкаваўся тут інжынерам-электрыкам. Так што падстаў для суму асаблівых няма.

Справа знойдзецца ўсім працаўнікам былога саўгаса — на фермах, у паляводстве, на абслугоўванні камунальнай гаспадаркі. Частку новых калгаснікаў пакуль будзем вазіць на работу на старыя палеткі, дзе можна займацца раслінаводствам.

Л. СТАЛЯРОВА, камендант інтэрната (дэманструе новую кватэру і адначасова расказвае пра сваё жыццё-быццё):

— Падрадчыкі працуюць тут вахтавым метадам: два тыдні, без адпачынкаў — на аб'екце, два — адпачываюць дома. Сёння прыбыла чарговая вахта мантажнікаў, таму выдаю ім чыстую пасцельную бялізну.

А гэта — мой трохпакаёвы катэдж з кватэрай на двух узроўнях. Як бачыце, маюцца ўсе выгоды: ванная, туалет, гараж, падвал, на вуліцы — гаспадарчая пабудова. У доме ёсць водаправод, ацяпленне, каналізацыя. Словам, кватэрай я задаволена.

Мае дзве дачкі ходзяць у мясцовую школу. Яна, праўда, старая, але ў наступным годзе здадуць новы тыпавы школьны будынак. Праз некаторы час у Шарэйках будзе арганізаваны новы сельсавет: думаю ўладкавацца туды на работу. Карацей кажучы, перспектывы — самыя звычайныя, як і ў кожнага звычайнага чалавека. Але ўсё ж такі — перспектывы...

Зона асаблівай увагі

П. ЛАСІЦА, намеснік начальніка будупраўлення Бярозаўскай ДРЭС (падраздзялення трэста «Белэнергабуд»):

— Працую на пляцоўцы са студзеня гэтага года практычна бязвыезна — вельмі шмат работы. Яшчэ восенню здалі ў эксплуатацыю 66 кватэр — у асобных катэджах і шматкватэрных дамах. Астатняе жыллё ўжо падрыхтавана да агляду камісіі і здачы.

Якая якасць нашай работы? Дзяржаўная прыёмная камісія за здадзеныя дамы выставіла нам адзнаку «добра». У гэтым плане, у адрозненне, скажам, ад нашых калег з трэстаў Оршы, Наваполацка, некаторых іншых бударганізацый, у нас праблем не было. Не менш высокую ацэнку даюць і навасельцы.

Дарэчы, мы ўзвялі тут не толькі жыллё. Нямала пабудавалі і аб'ектаў сацкультбыту — сталовую, лазню, магазін. А таксама кацельню, усе неабходныя сеткі інжынернага забеспячэння, ачышчальныя збудаванні. Шмат работы і наперадзе: у нашых тутэйшых планах — будаўніцтва дзіцячага сада, гандлёвага цэнтра, новай школы і г. д. Задзел пад школу, між іншым, ужо зроблены.

Як жывём? Нашы будаўнікі харчуюцца ў сваёй сталоўцы — атрымліваюць паўнацэнныя снеданні, абеды і вячэры. Прадукты ж завозіць аддзел рабочага забеспячэння трэста. Дадам, што трэст выдзяляе кожнаму свайму «вахтавіку» бясплатны талон на харчаванне. Калі ж хто з іх хоча падсілкавацца дадаткова — калі ласка: у мясцовым магазіне можна купіць хлеб, масла, каўбасу, малако, смятану.

Жыллёвыя ўмовы падрадчыкаў таксама на ўзроўні: маем тры добраўпарадкаваныя інтэрнаты з усімі выгодамі, а таксама сем трохпакаёвых катэджаў, усюды стаяць тэлевізары. І ўсё ж скажу ад сябе асабіста: раднага ў працяглым адрыве ад дому мала, сям'і і дзяцей тэлевізар не заменіць. З другога боку, мы разумеем, што такое грамадзянскі абавязак перад людзьмі, якія церпяць ад радыяцыі.

М. ПАЦЁМКІН, старшыня калгаса «Расія»:

— Штучнай узнёсласці не люблю, скажу аб'ектыўна: будаўнікі ажыццявілі вельмі патрэбную справу. Дамы пабудавалі на любы густ. Сапраўды, чаму сельскаму працаўніку не мець чатырох-пяціпакаёвую кватэру? Даўно пара.

Тое, што на калгаснай сядзібе з'явіліся сталовая, лазня, магазін, для нас выгадна. Нябла га было б займець і новую школу, гандлёвы цэнтр, дзіцячы сад. Будаўнікі абяцаюць здаць усё гэта ў тэрмін.

А вось што мне не падабаецца: нашым калгаснікам у першай чарзе новага пасёлка плануючыя органы чамусьці не выдзелілі ніводнай кватэры. Лічу гэта несправядлівым. Паглядзім, як сельсавет і райвыканком выканаюць сваё абяцанне — пры здачы другой чаргі прадаставіць нам чатыры-пяць кватэр для спецыялістаў і работнікаў сацыяльнай сферы.

Маю што сказаць і пра нашы вытворча-эканамічныя разлікі. У калгасе сёння сельскагаспадарчых угоддзяў — 2.444 гектары. І толькі 100 пар рабочых рук, а трэба мець хоць бы 300. На фермах практычна працуюць толькі пенсіянеры. Таму спецыяльна расшыраем дзве фермы — рыхтуем рабочыя месцы для перасяленцаў. Іншыя пойдуць у паляводчыя брыгады, хтосьці — у камунальныя службы пасёлка. А то ж да сённяшняга дня як было? У аддзяленні сувязі людзей не хапала, для работы ў быткамбінаце не маглі адшукаць нават аднаго-адзінага чалавека...

Цяпер, упэўнены, многія брэшы ў кадравым пытанні мы ліквідуем.

ЗАМЕСТ КАМЕНТАРЫЯ

Гэтыя чатыры інтэрв'ю — толькі невялікая карцінка, з якіх — і не вельмі радасных, і больш светлых — складаецца сёння агульны фон таго, як ідзе выкананне Дзяржаўнай праграмы па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Так, быў час дылетанцкага падыходу да вырашэння гэтай найвастрэйшай для Беларусі праблемы, хапала ведамаснага раўнадушша і ўсеагульнага бязладдзя.

Але вось мы маем факт: пры самых жорсткіх патрабаваннях з боку Дзяржаргбудкантролю да якасці работ падрадчыкі з трэста «Белэнергабуд» атрымліваюць паўнаважкую «чацвёрку». Можна толькі меркаваць, якая праца, ды яшчэ ў цяперашніх эканамічных умовах, стаіць за такой адзнакай.

Дык што, усё стала на нармальныя рэйкі, і справы на чарнобыльскім фронце ідуць у адпаведнасці з патрабаваннямі часу? Думаецца, з такім вывадам трэба пачакаць.

Вось некалькі штрыхоў да гісторыі ўзвядзення пасёлка ў Шарэйках. Сам выбар пляцоўкі быў крайне няўдалым — у балоцістым месцы (падобная паспешлівасць і непрафесійнасць даюць аб сабе знаць ужо і яшчэ дадуць у будучым). Але дзякуй будаўнікам — яны сваёй працай выправілі гэтую памылку.

Падраднай арганізацыі, якая спецыялізуецца на ўзвядзенні буйных энергетычных аб'ектаў, адразу перапрафіліравацца на малыя катэджы было складана: на гэта спатрэбіўся пэўны час, і будаўнікі атрымалі сваю долю крытыкі. Аднак гэта былі яшчэ кветачкі ў параўнанні з агульнымі абвінавачваннямі, нават патрабаваннямі разагнаць кіраўніцтва трэста, якія абрынуліся тады, калі вялікія начальнікі не ўбачылі закладзеных «каробак», дамоў-паўфабрыкатаў, як ім таго хацелася. Пытаннем, ці можна будзе ў іх жыць, ніхто не задаваўся: галоўнае — своечасова зрабіць справаздачу і тым самым абараніць сябе ад непрыемнасцей.

Быццам і няўцям было высокапастаўленым «штурхачам», што спецыялісты-падрадчыкі працуюць у згодзе з усімі патрабаваннямі эканомікі і навукі: каб не ўводзіць дзяржаву ў дадатковыя страты, спачатку пабудавалі кацельню, праклалі неабходныя камунікацыі і дарогі. Вось тады і пачалі расці як грыбы гатовыя дамы — з цяплом і водаправодам, толькі ўсяляйся. Вярнулі будаўнікі і мінулагоднюю запазычанасць, выканалі і сёлетняе заданне — 166 кватэр прымаюць перасяленцаў.

...Нядаўна ў Шарэйках пабывала высокая камісія з Саўміна рэспублікі. Яе кіраўнікі, быццам забыўшыся пра тыя эпітэты, што ляцелі ў адрас простых выканаўцаў, якія, як вядома, у нас заўсёды «крайнія», канстатавалі: «Сюды можна больш не ездзіць. Усё робіцца на ўзорна-паказальным узроўні». На жаль, прабачэння за былыя кпіны ніхто не папрасіў, нават простага «дзякуй» будаўнікі не дачакаліся. Але калі па шчырасці, дык іх куды больш грэюць цёплыя словы, якія яны чуюць ад простых працаўнікоў-навасельцаў.

Стаяць прыгажуны-катэджы на шырокіх вуліцах, якія пакуль носяць умоўныя назвы — па тых гарадах, дзе размяшчаюцца падраздзяленні трэста: Лукомская, Магілёўская...

Не ў назвах, вядома, справа. Хоць у глыбіні душы будаўнікі (і гэта так па-чалавечы зразумела!) спадзяюцца на тое, што ўдзячныя сяляне такім чынам захаваюць памяць аб іх працы і нічога перайменоўваць не стануць...

Дзякуй вам, будаўнікі, за навагодні падарунак, які вы зрабілі людзям!

Валерый ЧАРНЯЎСКІ, спецыяльны карэспандэнт «Звязды».

На здымку: адна з новых вуліц у Шарэйках.

Фота В. ЦІМОШЧАНКІ.

Драма Грузіі. Акт не першы. Але ці апошні?

Што адбываецца ў Тбілісі пасля сапраўдных баёў? Адказ на гэтае пытанне мы паспрабавалі ў чацвер атрымаць па тэлефоне ў пастаянным прадстаўніцтве Рэспублікі Грузія ў Маскве. Да апарата падышоў намеснік пастаяннага прадстаўніка Георгій Вольскі.

— Якая зараз абстаноўка ў Тбілісі?

— Спакойная. Прэзідэнт Гамсахурдыя не збіраецца ісці ні на якія ўступкі апазіцыі. Сітуацыя кантралюецца сіламі, вернымі законнай уладзе. Апазіцыя ініцыятыву страціла, хаця пакуль няясна, дзе знаходзяцца іх узброеныя сілы і што яны думаюць рабіць далей. Але галоўнае, што народ падтрымлівае законна абранага прэзідэнта.

— У друку былі паведамленні, што на дапамогу Грузіі накіраваны гвардзейцы Чэчэнскай Рэспублікі. Гэта праўдзівая інфармацыя?

— Чэчэнскі бок адмаўляе адпраўку якіх бы там ні было ўзброеных фарміраванняў у Грузію. Мы таксама не бачылі чэчэнскай гвардыі.

— Якая рэакцыя ў свеце на падзеі ў Грузіі?

— Захад выказаўся ў падтрымку законнага прэзідэнта і законнай улады. Толькі што Сі-Эн-Эн перадала, што ЗША афіцыйна прызналі Грузію, як, дарэчы, і Беларусь, з чым вас і віншую. Нашу незалежнасць прызнала таксама Канада, чакаем такой жа весткі з Японіі.

Гэта афіцыйны пункт погляду. З-за немагчымасці мець інфармацыю ад апазіцыі, мы пакідаем яго без каментарыя.

А што думаюць пра падзеі простыя людзі, жыхары Тбілісі? Мы набралі выпадковы нумар тэлефона. Нашым субяседнікам аказаўся інжынер Гіві Гурашвілі:

— Ходзяць чуткі, што ў нас пачынаецца грамадзянская вайна. Але магу з поўнай адказнасцю заявіць, што нічога такога няма. Проста справа дайшла да ўзброенага канфлікту паміж апазіцыяй, з аднаго боку, і прыхільнікамі Гамсахурдыя — з другога.

ШАШКІ

Рускія шашкі
Конкурс № 91
Заданне № 11
А. Акуліч
(г. Віцебск)

Белыя: простыя d4, e3, f2 (3).
Чорныя: простыя d8, g5, g7 (3).
Ход і выйгрыш белых (тры ачкі).

Заданне № 12
К. Тарасевіч
(Бярозаўскі р-н)

Белыя: дамкі a5, c3, d2, f4, f8, g7, h4, h6, простыя e7, f6 (10).
Чорныя: дамка d8, простая a7 (2).
Белыя пачынаюць і запіраюць простую чорных (чатыры ачкі).
На гэтым заканчваем конкурс.

ШАШКІ+ШАХМАТЫ
Другі конкурс
Заданне № 24
В. Шульга
(г. Мінск)

Белыя: коні a7, d2, пешка c3 (3).
Чорныя: простыя шашкі a3, a5 (2).
Белыя пачынаюць і запіраюць простую чорных (адно ачко).

Заданне № 25
Ул. Сапяжынскі
(г. Рагачоў)

Белыя: слон c3, конь e2, простая шашка c1 (3).
Чорныя: простая шашка d6 (1).
Белыя пачынаюць і запіраюць простую чорных (адно ачко).
Чакаем вашых рашэнняў, а таксама ацэнак гэтых казачных задач па зместу ад 0 да 10 ачкоў.
Заканчваем і гэты конкурс.
У наступным выпуску вас чакаюць новыя конкурсы па рускіх, міжнародных шашках і трэці конкурс «Шашкі+шахматы».

АБ ХОДЗЕ КОНКУРСУ

У заданні № 25 (аўтар П. Шклудаў) можна перамагчы і пасля 1. cd4 (c7) 2. de5 3. Cb4x. Знайшлі ўдзельнікі нашага другога конкурсу «Шашкі+шахматы» А. Акуліч, П. Шклудаў, В. Шульга і Ул. Сапяжынскі. У заданні № 26 (аўтар П. Шклудаў) выйграе і 1. Ke4 — паведаміў А. Акуліч.

Задача № 29 (аўтар М. Грушэўскі) мае таксама іншыя рашэнні, іх прывялі А. Акуліч, В. Шульга і П. Шклудаў. Цікава, што без надстаўкі задача выглядае лепш і пабочных рашэнняў не мае: **белыя** — слон b8, дамкі c1, c3 (3), **чорныя** — простая b6 (1). Рашэнне: 1. Сл. e5x.

У задачы № 31 (аўтар П. Шклудаў) для дакладнасці рашэння трэба белую дамку замяніць на слана, а белую простую h4 — на пешку і дабавіць чорнага ферзя на g5.
У наступным выпуску паведамім вынікі гэтага конкурсу.

«Над Нёманам і Ашмянкай»

Гісторыя без «белых плям»

Пад такой назвай у Кашаліне (Рэспубліка Польшча) нядаўна выйшла ў свет цікавая кніга гісторыка Тадэвуша Гаштольда. У ёй расказваецца пра некаторыя важныя, але дагэтуль амаль не вывучаныя ў савецкай гісторыяграфіі старонкі другой сусветнай вайны, у прыватнасці, пра дзейнасць польскага падполля і фарміраванне польскай Арміі Краёвай у Стаўбцоўскім, Валожынскім, Івянецкім, Навагрудскім, Маладзечанскім, Ашмянскім раёнах у гады нямецка-фашысцкай акупацыі.

Адным з найбольш вядомых кіраўнікоў і стваральнікаў Стаўбцоўскай ваеннай арганізацыі Арміі Краёвай быў ураджэнец тутэйшых месц паручнік Каспер Мілашэўскі. Пад яго кіраўніцтвам распрацавана і паспяхова праведзена аперацыя па разгрому нямецкага гарнізона ў гарадскім пасёлку Івянец 19 чэрвеня 1943 года. Гэты гарнізон налічваў больш як 300 добра ўзброеных гітлераўцаў.

У прыведзеных у кнізе ўспамінах К. Мілашэўскі піша, што к канцу аперацыі ў раён Івянца прыбыў камісар партызанскай брыгады імя Чкалава І. П. Казак з некалькімі байцамі і прапанаваў сваю дапамогу. Але справа ўжо была зроблена, і Мілашэўскі падзякаваў чкалаўцам і прапанаваў ім узяць з нямецкіх складаў муку і соль, што там заставаліся. Ад сябе дадам, што ў гэты час брыгада імя Чкалава, знаходзячыся ў засадзе, блакіравала ўязныя дарогі ў Івянец з боку Мінска і Валожына. Пасля адыходу раніцай з Івянца атрада Мілашэўскага з вялікім абозам у Налібоцкую пушчу пасёлак быў акружаны нямецкімі войскамі, прыбыўшымі з Мінска на танках і бронетранспарцёрах. Партызаны брыгады імя Чкалава сустрэлі іх агнём, але вымушаны былі адступіць у глыб пушчы з невялікімі стратамі. Так скончылася адна з буйных партызанскіх аперацый у Івянецка-Налібоцкай партызанскай зоне. Пасля яе хутка пачалі папаўняцца добраахвотнікамі з ліку мясцовай моладзі польскія і савецкія партызанскія фарміраванні. Атрад (батальён) АК Мілашэўскага вырас да 650 чалавек.

Адносіны з камандаваннем партызанскіх фарміраванняў Баранавіцкага злучэння, якія таксама дыслацыраваліся ў Налібоцкай пушчы, былі нармальнымі. Але польскіх і савецкіх партызан у Налібоцкай пушчы чакалі цяжкія выпрабаванні. У ліпені-жніўні 1943 года нямецкае камандаванне кінула супраць іх амаль 60-тысячныя войскі, у тым ліку жандармерыю і паліцыю, з танкамі, артылерыяй і самалётамі.

На спецыяльнай нарадзе камандавання палякаў і савецкіх партызан было вырашана ўзаемадзейнічаць пры абароне пушчы. Польскаму батальёну было даручана перакрыць тракт, што вядзе з Навагрудка праз Налібокі, Івянец на Мінск. Савецкія партызаны занялі абарону ў паўднёвай і паўночнай частках пушчы. Больш трох тыдняў ішлі цяжкія баі з карнікамі. У партызан скончыліся боепрыпасы, прадукты. Давялося прымяніць такую тактыку: раздзяліўшыся на невялікія баявыя групы, прарывацца з акружэння і біць праціўніка з тылу. Гэта тактыка апраўдала сябе.

Пасля гэтай аперацыі ў камандаванні польскага батальёна АК, гаворыцца ў кнізе, адбыліся істотныя змены: камандзірам стаў маёр В. Пелка (псеўданім «Вацлаў»), а паручнік К. Мілашэўскі (псеўданім «Ноч», «Нячай») быў назначаны ад'ютантам батальёна і адначасова афіцэрам па сувязі з савецкім партызанскім злучэннем. Падпаручнік А. Пільх (псеўданім «Гура»), прыбыўшы ў пушчу восенню 1943 года з Лондана як эмісар польскага ўрада, стаў камандаваць падраздзяленнем пяхоты, а харунжы Эд. Нуркевіч — эскадронам кавалерыі. К канцу лістапада 1943 года ў батальёне налічвалася амаль 500 салдат. З гэтага часу, ва ўмовах разрыву ў красавіку 1943 года савецкім урадам дыпламатычных адносін з эмігранцкім урадам Вл. Сікорскага, пачалі абвастрацца адносіны паміж савецкімі партызанамі і польскім батальёнам АК. Справа дайшла да ўзброеных сутычак паміж імі і гібелі байцоў з таго і другога бакоў.

Скончылася тым, што згодна з загадам штаба Баранавіцкага партызанскага злучэння, польскі батальён 1 снежня 1943 года быў абяззброены і расфарміраваны, а яго камандаванне (Пелка, Мілашэўскі і іншыя) інтэрніравана і праз некаторы час самалётам накіравана ў Маскву. Тут іх пасадзілі ў турму, потым перавялі ў лагер ваеннапалонных у Разані, і толькі ў 1948 годзе яны вярнуліся ў родную Польшчу. Удалося пазбегнуць арышту і ўцячы з лагера А. Пільху і 20 польскім салдатам. Конны эскадрон на чале са Зд. Нуркевічам у гэты час знаходзіўся за межамі асноўнай базы і пазбег раззбройвання. Праз некалькі дзён гэтыя групы аб'ядналіся, папоўніліся былымі салдатамі расфарміраванага батальёна (якім было рэкамендавана ўступаць у савецкія партызанскія атрады ці разысціся па дамах) і зноў аднавілі баявую адзінку Арміі Краёвай. Гэта падраздзяленне ўступіла ў кантакт з камандаваннем нямецкага гарнізона ў Івянцы, заключыла з імі перамір'е, згодна з якім польскі батальён атрымаў ад немцаў зброю і боепрыпасы і расквартараваўся ў навакольных населеных пунктах Міхалава, Гілікі, Старынкі, Камень, стаўшы свайго роду прыкрыццём, заслонай івянецкаму гарнізону ад савецкіх партызан. З гэтага часу пачаліся частыя ўзброеныя сутычкі польскіх легіянераў з партызанамі, што каштавала немалых чалавечых ахвяр таму і другому боку.

Аўтар кнігі абвінавачвае ва ўсім, што здарылася, толькі савецкае партызанскае камандаванне. Мы з гэтым не можам цалкам пагадзіцца. Аглядваючыся назад, трэба сказаць, што яўна памылковы, на мой погляд, быў загад аб раззбраенні палякаў 1 снежня 1943 года і ўсё, што адбылося потым. Абодва бакі — і палякі, і савецкія партызаны — не праявілі належнай цярплівасці, такту ў справе мірнага вырашэння канфлікту і ўмацавання баявога супрацоўніцтва ў барацьбе супраць агульнага ворага. Замест гэтага звярнуліся да крайніх, непрадуманых захадаў.

Супрацоўніцтва польскага батальёна з немцамі працягвалася шэсць месяцаў і скончылася тым, што ў чэрвені 1944 года ў час беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён» батальён, які налічваў 1.200 салдат, зрабіў 600-кіламетровы рэйд з-пад Івянца ў Кампіноскую пушчу пад Варшаву. Яго камандзір А. Пільх звязаўся з мясцовымі фарміраваннямі польскіх партызан і камандуючым падраздзяленнямі Арміі Краёвай у Варшаве генералам Бур-Камароўскім. Тут «крэсавікі», г. зн. прыбыўшыя з «крэсаў усходніх», добра ўзброеныя польскія салдаты АК прынялі актыўны ўдзел у Варшаўскім паўстанні, у прыватнасці ў аперацыі па захопу аэрадрома Беляны пад Варшавай, і ў іншых баях. Многія з іх загінулі за свабоду і незалежнасць Польшчы.

У кнізе шмат цікавых гераічных і драматычных старонак барацьбы атрадаў і брыгад АК пад Маладзечна, Вілейкай, Ашмянамі, Браславам, Вільнюсам, у іншых месцах. Яе вартасцю з'яўляецца таксама вялікая колькасць фотаілюстрацый. Кніга з'яўляецца пэўным укладам у гісторыю другой сусветнай вайны і польска-савецкіх адносін у 1939—1945 гадах.

Аляксандр ХАЦКЕВІЧ,
доктар гістарычных навук, прафесар, былы партызан.

ЯГО ЛІЧЫЛІ ЗНАХАРОМ...

Ваша здароўе

У ПАЧАТКУ сямідзесятых гэтага ўрача многія прымалі за дзівака. Як жа, усё нейкімі травамі ды мазямі лячыў. А афіцыяльныя ўлады тады не вельмі заахвочвалі фітатэрапію (лячэнне травамі). Гэта лічылася несучасным, лёсам неадукаваных старых. І, магчыма, не сутыкніся ва ўласным жыцці Яўген Шмярко, тады яшчэ пачынаючы ўрач, з уласным горам, так і працягваў бы лячыць сваіх пацыентаў традыцыйнымі таблеткамі ды ўколамі. Але... цяжка захварэла жонка. Не дапамагалі ні найноўшыя прэпараты, ні вядомыя айчынныя «знаўцы». І прыгадаў Яўген Пятровіч народную медыцыну...

А потым усур'ёз пачаў вывучаць гаючыя травы, ішоў практычна ўсляпую: распытваў пажылых знаёмых, рыхтаваў зборы, настоі, штудзіраваў тоўстыя падручнікі. Такая самастойнасць, відаць, аказалася не па душы начальству. Камісіі назначаліся за камісіяй, і адзінай мэтай правяраючых было «адлучыць» і «не пускаць». Але Я. Шмярко надавалі сілы вылечаныя ім пацыенты — простыя сельскія жыхары, якія прыязджалі да яго з усёй акругі, дзякавалі.

Сёння Яўген Пятровіч працуе галоўным урачом санаторыя-прафілакторыя «Будаўнік» будтрэста № 15, што ў пасёлку Зялёнае пад Мінскам. І, напэўна, невыпадкова лечаць у гэтым прафілакторыі і аздараўліваюць травамі. А пачынаць і тут прыйшлося практычна з нуля. З цяжкасцю набывалі спецыяльнае абсталяванне, ладзілі сауну, залу лячэбнай фізкультуры, памяшканне для гульні ў тэніс. Праўда, было ўжо шмат аднадумцаў, памочнікаў.

Тых, хто працуе ў прафілакторыі, з поўнай падставай можна называць энтузіястамі. І не толькі таму, што іх праца цяжкая фізічна — трэба насіць вёдры з запаранымі травамі, рыхтаваць травяныя аплікацыі, ванны, адвары. Яны па-сапраўднаму адданыя ёй, ахвяруючы свой вольны час, не зважаючы на нізкую заработную плату.

Аднак, як бы ні хацелася дапамагчы ўсім маючым патрэбу, такой магчымасці, на жаль, няма. Справа ў тым, што прафілакторый з'яўляецца ўласнасцю трэста № 15 «Спецбуд» і аздараўлівацца ў ім маюць права ў асноўным работнікі трэста.

Год назад калектыў медыкаў хацеў узяць прафілакторый у арэнду ці выкупіць у калектыўную ўласнасць. Прычым трэсту гарантавалася любая неабходная колькасць месц. Аднак з яго кіраўніцтвам так і не ўдалося дамовіцца.

І ўсё ж, нягледзячы на незгаворлівасць адміністрацыі, Яўген Пятровіч працягвае марыць аб Цэнтры народнай медыцыны, дзе кожнаму можна было б паправіць здароўе.

Чаго ж дабіваецца гэты неўтаймоўны чалавек? Славы, грошай? Наўрад ці. Бо, валодаючы унікальнымі ведамі, не нажыў Яўген Пятровіч за ўсе гэтыя гады ні машыны, ні дачы, ні іншых матэрыяльных даброт. Уся яго радасць — шчырыя словы ўдзячнасці, якія вельмі часта чуе ён як ад будаўнікоў, так і ад «выпадковых» пацыентаў, што прыязджаюць да яго, як у апошнюю «інстанцыю».

А. ШУМАРАВА.

На здымках: урач-фітатэрапеўт **Я. Шмярко**, медсястра **Г. Шчарбакова** з пацыенткай, медсястра **Р. Граковіч.**

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

Паважаныя таварышы!

Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь паведамляюць, што

ПРОДАЖ НАВАГОДНІХ ЁЛАК

у гарадах арганізуюць гандлёвыя арганізацыі на спецыяльна абсталяваных базарах, у іншых населеных пунктах — лясгасы і лясніцтвы па калектыўных заяўках працоўных калектываў і асобным грамадзянам.

Набывайце НАВАГОДНІЯ ЁЛКІ ва ўстаноўленым парадку, не дапускайце самавольных высечак хвойных маладнякоў, не набывайце іх у пабочных асоб.

Аказвайце дапамогу работнікам лясной аховы ў прадухіленні лесапарушэнняў.

Да ведама чытачоў

Рэдакцыя газеты «Звязда» прымае ад насельніцтва прыватныя аб'явы. Тэрміны змяшчэння іх на старонках газеты — мінімальныя. Аплата — тры рублі за адзін радок (24 літары). Разліковы рахунак рэдакцыі газеты «Звязда» 609868 у Мінскім камерцыйным банку рэканструкцыі і развіцця «Мінскбізнесбанк», код 739.

Даведкі па тэлефонах: 32-35-91, 32-51-05.

НАДВОР'Е

27 снежня

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае надвор'е, часам снег, мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ў Гродна і Брэсце—1—3, Мінску—2—4, Віцебску, Магілёве і Гомелі—3—5 градусаў марозу.

У наступныя двое сутак часам снег. Тэмпература паветра ўначы 28-га снежня 3—8, пры праясненнях да 13 градусаў марозу, удзень 1—6 градусаў марозу. 29-га снежня ўначы 1—6 градусаў марозу, удзень—ад 4 да 1 градуса цяпла.

Узровень радыяцыйнага гама-фону 26 снежня складаў: у Мінску—0,012, Віцебску—0,014, Магілёве—0,014, Гомелі—ад 0,011 да 0,030, у Гродна—0,010 мілірэнтгена ў гадзіну. Натуральны радыяцыйны гама-фон на тэрыторыі рэспублікі знаходзіцца ў межах ад 0,010 да 0,020 мілірэнтгена ў гадзіну.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

27 снежня

Праграма Беларускага тэлебачання

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Алтайскія эцюды». Кінанарыс.
9.00. Выяўленчае мастацтва. 3 клас.
9.20. «Батыр Закіраў». Тэлефільм.
10.00. Меркурый. Праграма для дзелавых людзей.
11.00. «Пятае кола».
13.00. «Хто прылашчыць коніка?» Дак. фільм.
13.25. А. Макаёнак. «Дыхайце эканомна». Тэлеспектакль.
16.10. Чэмпіянат СССР па воднаму пола. СКІФ—РШВСМ (Мінск) — «Тарпеда» (Масква).
16.45. Меркурый. Праграма для дзелавых людзей.
17.45. «Фэт Фрумас і сонца». «Бач ты, масленіца!» Мультфільмы.
18.00. «Весьціца». Інфармацыйная праграма.
18.15. «Дойліды». Дак. фільм.
19.00. Панарама.
19.25. Наш каментарый. «Падатковая квота».
19.30. Працістаянне. Маральна-прававая праграма.
20.45. Калыханка.
21.00. «Вяртанне на Таймыр». Дак. фільм.
21.20. Тэлебіржа.
21.35. НІКа.
21.50. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — «Песню бярыце з сабою». Фестываль беларускай песні. Перадача 2-я.

Праграма першая

6.30. Раніца.
9.05. «Жанчына: варыянт лёсу». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
10.15. ...Да 16 і старэйшым.
11.00. «Тры сустрэчы на Урале».
12.00. ТСН.
12.10. Музыка ў эфіры.
14.10. Біржавыя навіны.
14.30. Брыдж.
15.00. ТСН (з сурдаперакладам).
15.15. Рускія песні спявае Т. Пятрова.
15.30. «Уваход у лабірынт». Мастацкі фільм. 5-я серыя.
16.35. Дзіцячая гадзіна. «На балі ў Папялушкі».
17.35. «Руская песня». Пра творчасць мастака В. Барысава-Мусатава.
18.00. ТСН.
18.15. Чалавек і закон.
18.55. Палітычнае расследаванне. «Афганістан: за кулісамі вайны». Інтэрв'ю А. М. Якаўлева.
19.40. «ВІД» прадстаўляе: «Поле цудаў».
21.00. Інфармацыйная праграма.
21.35. «ВІД» прадстаўляе: «Поле цудаў», «Матадор». «Музаагляд віншуе», «Шоу-біржа». У перапынку — ТСН.
1.05. «Тым больш, што жыццё кароткае такое...»
2.45. Канцэрт Вялікага сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам У. Федасеева.

Расійскі канал

8.00. Ранішняя гімнастыка.
8.15. Час дзелавых людзей.
9.15. Англійская мова. 1-ы год навучання.
9.45. Англійская мова. «Сямейны альбом» (ЗША).
10.15. «Пунцовая кветачка». Мультфільм.
17.00. «Меў бы я залатыя горы...» Цыкл «Зямля трывогі нашай».
17.40. «Бочка», «Проста так». Мультфільмы.
18.00. Карупцыя: трусы і ўдавы.
19.00. «Калядны пірог». Праграма для дзяцей.
19.15. Відэаканал «Урал ТВ».
20.00. Весткі.
20.20. Добрай ночы, малышы!
20.35. «Другая руская рэвалюцыя» (Бі-бі-сі). 8-я серыя.
21.40. На сесіі Вярхоўнага Савета РСФСР.
22.00. Тэатральны раз'езд. БДТ: учора, сёння, заўтра. Таўстаногаў. Частка 1-я.
23.00. Весткі.
23.20. «Тэатрал». Наваселле на Арбаце.
0.30. Джаз-тайм. Святочны выпуск «Сусветны джаз».

28 снежня

Праграма Беларускага тэлебачання

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Экалагічны веснік.
9.25. Праграма Гомельскай студыі тэлебачання.
10.35. 20 мінут рэдактара. Па пісьмах гледачоў.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Вучымся бізнесу. Праблемы малога бізнесу.
11.55. Гамбіт. Тэлевізійны шахматны клуб.
12.25. Адраджэнне. Культурна-асветная праграма.
13.05. «У згодзе і спрэчках з Мельпаменай». Народны артыст Рэспублікі Беларусь С. Штэйн.
13.50. «Востраў скарбаў». Мультфільм.
14.40. «Тое-сёе з паштовай сумкі». Пацяшальная праграма з удзелам дзіцячай драматычнай студыі.
15.10. ПІК. Пазнавальна-інфармацыйны канал для падлеткаў.
16.10. Воднае пола. СКІФ—РШВСМ (Мінск) — «Дынама» (Кіеў).
16.45. «Маналог старога самавара». Кінанарыс.
17.00. «Непераможныя». Мультфільм.
17.10. Для школьнікаў. Падказкі на манжэтах. Навагоднія парады.
17.55. Бізнесклуб «Партнёр». Перадкавагодняя сустрэча прадпрымальнікаў.
19.00. Панарама.
19.25. «Балет Ігара Майсеева». Фільм-канцэрт.
20.30. «Тут могуць вадзіцца тыгры», «Парк культуры». Мультфільмы для дарослых.
20.45. Калыханка.
21.00. «Галубы мае вы мілыя...» Дак. фільм.
21.20. Тэлебіржа.
21.35. НІКа.
21.50. «Аднойчы праз дваццаць год». Мастацкі фільм.
23.05. «Песню бярыце з сабою». Фестываль беларускай песні. Перадача 3-я.

Першая праграма

6.30. Мультфільмы «Дзяўчынка і дэльфін», «Незвычайны матч».
7.00. Рытмічная гімнастыка.
7.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
8.30. ТСН.
8.45. Відэаканал «Садружнасць».
10.00. Наш сад.
10.30. Інстытут чалавека.
11.10. Ранішняя пацяшальная праграма.
11.40. «Цэнтр».
12.25. Фільмы рэжысёра М. Каліка. «Цана».
14.15. Музычны кіёск.
14.45. ЭХ. Экалагічная хроніка.
15.00. ТСН (з сурдаперакладам).
15.15. «Гонг».
16.30. У свеце казак і прыгод. «Дванаццаць месяцаў».
17.40. Ведзі.
18.25. «Каханне з першага погляду». Дзень першы.
19.05. «Пчала Мая» (Германія—Аўстрыя). 26-я серыя.
19.30. Кінапанарама.
21.00. Інфармацыйная праграма.
21.35. «Што? Дзе? Калі?».
22.50. ТСН.
23.10. «Еўропа плюс».
0.10. «Фелікс» — еўрапейскі брат «Оскара».
1.40. «Начная феерыя».

Расійскі канал

8.15. «Каўказ-рэвю» (Пяцігорская студыя ТБ).
9.00. Баскетбольны агляд НБА.
9.30. «Востраў Жамчужына».
10.00. «Ціхая ноч».
10.30. «Не строй дурня, Амерыка». Пра жыццё рускіх на Аляксы.
11.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
13.00. Тэатральны капуснік. Тэатр «4-я сцэна».
15.00. Выратуй і захавай.
16.00. Са сваёй званіцы.
16.20. «Новы Пігмаліён».
17.05. Аты-баты... «Звярніце ўвагу».
17.40. «Калядны пірог».
17.55. Вакол Булгакава. Перадача 5-я.
18.55. Парламенцкі веснік Расіі.
19.10. «Познер і Донах'ю».
20.00. Весткі.
20.20. Добрай ночы, малышы!
20.35. «Белая варона».
21.35. Тэлецыкл «Нашчадкі».
21.55. Тэатральны раз'езд. БДТ: учора, сёння, заўтра. Я. Лебедзеў, У. Стржэльчык, А. Басілашвілі і іншыя. Частка 2-я.
23.00. Весткі.
23.20. Расмузімпарт. Святочны выпуск.

РАДЫЁ

28 снежня

Апошнія паведамленні: 5.00 6.00, 10.00, 15.00, 16.00, 17.00, 19.00, 20.00.

7.00—«Суботнім ранкам». Музычна-публіцыстычны выпуск. 8.15—«У нас у гасцях—часопіс «Вожык». 9.15—Гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». Праграма «Радыёкантакт». 10.15—«Жывое слова». Радыёклуб. 10.35—салісты іграюць з аркестрам. 11.00—новыя запісы музычнай фанатэкі. 11.30—«Увайсці ў кожны дом». 12.00—«Іграюць баяністы». Музычная перадача. 12.30—Г. Грын. «Апошняе слова». Апавяданне. Чытае М. Пянькоў. 13.00—«Шоу Леаніда Ярмольніка». Забаўляльная праграма. 14.00—«Для веруючых і няверуючых». 14.25—«Рытмы маладзёжнай эстрады». Канцэрт. 15.15—«Знаёмае і незнаёмае». Канцэрт-загадка. 16.15 — «Рамантыкі». 17.15—«З беларускай музычнай спадчыны». У. Алоўнікаў. Сімфанічная паэма «Партызанская быль». 17.30 — «Наша мінуўшчына». Гістарычны радыёчасопіс. 17.50—Машэрава, 21. Прафсаюзны веснік. 18.00—«У люстэрку падзей». Перадача на міжнародныя тэмы. 18.15—музычная праграма, прысвечаная калектыву мінскага вытворчага аб'яднання крухмальнай прамысловасці «Крышталь». 19.31 — «Старонкі класічнай музыкі». Канцэртная праграма. 20.00—«Дзень нашага жыцця». 20.15—вячэрняя казка. 20.30—«Вячэрнія зарніцы». 21.00—«Новы часопіс — новым чытачам». 21.20—п'есы для клавесіна. 21.40—«О, край родны, край прыгожы». Рэпартаж з літаратурнага вечара на радзіме Якуба Коласа. 22.15—«Паўгадзіны з меламанам». Эстрадная праграма. 22.45—«У вашу фанатэку». 23.00 — мастацкі канал «Вечары на вуліцы Качалава».

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ
СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Заява М. С. Гарбачова аб адстаўцы з пасады Прэзідэнта СССР.

«Наменклатурны рэдактар, ці Апаратная гульня пад назвай «Хто ў Саўміне перакрэсліў подпіс прэм'ера?» Да пытання аб заснавальніцтве «СБ».

«Абзац».

«Рэспубліка Беларусь: папярэдзіць канфлікты». Абмяркоўваем праект Канстытуцыі.

«Шукаем выйсце». Будаўнічыя справы ва ўмовах рыначнай эканомікі.

Праблемы быту. **«Скінемся на... траіх?»**

«Кругагляд». Агляд міжнародных падзей.

«У садзе і агародзе». Падборка.

Узровень радыяцыйнага гама-фону.

Фільмы тыдня.

Праграма тэлеперадач.

Афіша дня.

Галоўны рэдактар У. Б. НАРКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77. рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52; 32-41-92, рэкламы і аб'яў — 32-35-91, навін — 32-60-13.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку»

Тыраж 102.822.
Індэкс 63850.
Зак. № 247.

Выходзіць 250 разоў на год.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12